Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

СТУДЗЕНЬ 8 1933 г. № 6 (4550)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краін, злучайцеся

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—Ня менш 9 тыс. тон у дзень!

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ: А. АЛЕКСАНДРОВІЧ—Пра шэфаў, радыё, кіно і драмгурток (2 стар.). А. СУЧКОВА—Ноч перад новым годам (2 стар.). В. САМУЦІН—Ніці ідзалёгічнага свяцтва (2 стар.). М. РАБЦЭВІЧ—Перарадкэнцы з Багомлю (3 стар.).

ФЭЛЬЕТОН: ВІТ. ДАЛЬ—Дадаткі і зьмены ёсьць... (3 стар.).

АБ ПАПЯРЭДНІХ ВЫНІКАХ ПРАВЕРКІ КАНТЫКГЕНТАЎ РАБОЧАГА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ ПА ГОРАДУ МЕНСКУ—пастанова бюро Менгаркому (3 стар.).

НЕ ПАЗЬНЕЙ 15-га СТУДЗЕНЯ ЗАВЯРШЫЦЬ БУЛЬБАЗАГАТОЎКІ. Да канца зла маць дэмабілізацыйныя настроі на гэтым адказьнейшым вучастку загатован (2 стар).

Справа контр-рэвалюцыянэраў-шкодніцтваў з Белдзяржсэнсабу (4 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Узбраеньне Японіі (4 стар.).

Сакрэтнае спатканьне Гітлера з фон-Папэнам (4 стар.).

Вялікі палітычны працэс у Варшаве (4 стар.).

Ня менш 9 тысяч тон у дзень!

Плян загатовак бульбы ў гэтым годзе значна меншы за леташні. Насеўная-ж плошча пад бульбай у гэтым годзе яна многа павялічылася. Усё гэта, здавалася-б павінна было спрыяць хутчэйшаму выкананьню загатоўчага пляну. Між тым бульбазагатоўкі праходзяць надзвычай павольнымі тэмпамі, якія не даюць пэўных гарантый у тым, што загатоўкі будуць завершаны да 15-га студзеня.

Паводле даных на 6-га студзеня, плян выкапан на 84 проц. Каб да 15-га студзеня загатовіць астатнія 16 проц., або 67 з лішкам тысяч тон, **трэба загатаўляць штодзенна больш 9 тыс. тон,** а загатаўляем за дзень максымум 2.500 тон. Такім чынам, калі мы з сёньняшняга-ж дня не павялічым у тры, нават у чатыры разы, тэмпы загатовак, мы апынемся перад найглыбейшым прарывам па адным з важнейшых вучасткаў загатоўчага фронту.

Прыходзіцца зноў і зноў падкрэсьліць, што большасьць раённых арганізацый недаацэньвае вялізнага гаспадарчага і палітычнага значэньня бульбазагатовак. У гэтай недаацэнцы таго, што бульба, як і збожжа і мяса, вырашае зараз пытаньне далейшага паляпшэньня рабочага снабжэньня—асноўная прычына нашага адставаньня. Не даацанілі раённыя арганізацыі і сілы процідзеяньня клясавага ворага, які разбазарвае і хавае бульбу, узмоцнена спекулюе ёю на рынку і ўсімі сіламі імкнецца сарваць выкананьне загатоўчага пляну.

Шляхам вялікай канцэнтрацыі сіл нам удалося, і то з вялікім спазьненьнем, выканаць заданьне па адгрузцы бульбы Ленінграду. З раёнаў пасылаліся ўрачыстыя рапарты, у якіх абвяшчалася аб завяршэньні адгрузкі. Пры гэтым **было забыта, што скончэньне адгрузкі не азначала яшчэ выкананьня ўсяго пляну бульбазагатовак.**

191 тыс. тон бульбы, адпраўленых Ленінграду, **склалі толькі 45 проц.** загатоўчага пляну. Адсюль ясна, што ня было ніякіх падстаў для «галавакружэньня ад посьпехаў». А між тым такое «галавакружэньне» мела месца.

Закончыўшы адгрузку Ленінграду, раённыя арганізацыі супакоіліся, зусім забыўшы, што неабходна яшчэ забясьпечыць бульбай гарады БССР, Чырвоную армію і броварную і крухмальна-патачную прамысловасьць рэспублікі. У результаце «пачвання на лаўрах», апартуністычнай бязьдзейнасьці, поўнага прадастаўленьня загатовак самацёку, мы мелі ў сьнежні рэзкае зьніжэньне тэмпаў загатовак. Даволі сказаць, што за гэты месяц намі загатоўлена **ўсяго толькі звыш 10 проц. гадавога пляну.** Пералому ў тэмпах мы ня маем і дагэтага часу.

З усіх раёнаў рэспублікі плян загатовак бульбы выканалі толькі Лельчыцкі, Расонскі, Менскі, Дрысенскі, Гомельскі, Асіпавіцкі, Жыткавіцкі, Асьвейскі, Камарынскі і Плешчаніцкі. Недапушчальна адстаюць Пропойскі, Лоўскі, Пятрыкоўскі, Карэлянскі, Рэчыцкі, Веткаўскі, Чэрыкаўскі, Жлобінскі, Вузьдзенскі, Крычаўскі, Сеньненскі і Глускі. Сярод пералічаных раёнаў некаторыя займаюць вялікую ўдзельную вагу ў загатоўках.

Мы лічым неабходным зноў падкрэсьліць, **што меншасьць многіх раённых арганізацый спалучыць барацьбу за розныя віды загатовак, не ўстанаўляючы чарговасьці ў іх правядзеньні.** У перыяд напружанай барацьбы за спаўтасовую і поўную адгрузку бульбы Ленінграду загатоўкі іншых асноўных відаў сельска-гаспадарчай прадукцыі фактычна былі адсунуты на задні плян. А потым, калі пачалі ўзмоцнена націскаць на збожжа і лён, на задні плян была адсунута бульба. Толькі Менскі і Гомельскі раёны здолелі пабальшавіцку спалучыць барацьбу за стопроцантнае выкананьне ўсіх загатоўчых пляноў.

«Правда» ад 4-га студзеня, аналізуючы ход бульбазагатовак у Беларусі, ускрыла спраўдзішнія прычыны нашага адставаньня. Неабходна рашуча пакончыць з апартуністычнай бязьдзейнасьцю, аліліўшчынай, славесна-дэкларацыйнымі адносінамі да правядзеньня генеральнай лініі партыі з боку многіх арганізацый рэспублікі. Неабходна рашуча змагацца з вельмі папыраючай у нас «рапартаманіяй», асабліва там, дзе для пераможных роляцый няма належных падстаў.

Не аслабляючы далейшай барацьбы за збожжа, узмацняючы тэмпы загатовак ільну, неабходна дабіцца неадкладнага пералому ў бульбазагатоўках. Да 15-га студзеня плян павінен быць поўнасьцю выкананы.

Перадавікі загатовак

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА. Сяжэньнскі сельсавет, у выніку разгрому кулацкага сабатажу і разгортаньня палітмасавай работы сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў, выканаў да 1 студзеня заданьне па збожжы на 102,5 проц. (206 тон замест 201), заданьне па ільнавалакну — на 84 проц. Загатоўкі працягваюцца.

ПАБУДЗЕЙ, І. ХРАЛОВІЧ.

***

СМАЛЯВІЧЫ. Азярышчанска - Слабодзкі сельсавет пад непасрэдным кіраўніцтвам райкому, у жорсткай барацьбе з кулаком і яго агентурай дабіўся вялікіх посьпехаў у выкананьні пляну загатовак.

Да 5 студзеня плян па ЗБОЖЖЫ выкананы на 106 проц., па БУЛЬБЕ — на 113 проц., па МЯСУ — на 180 проц., па ІЛЬНАВАЛАКНУ — на 108 проц., па ПЯНЬЦЫ — на 275 проц., па ІЛЬНАСЕМІ — на 90 проц., па КАНОПЛЯХ — 236 проц., па СЕНУ — 125,2 проц., па САЛОМЕ — 106,1 проц. Выкананы плян мабілізацыі сродкаў.

ВАЙНЭР, ГУРЫНОВІЧ і ШАРАМЭТ.

Асьвейскі, Сеньненскі, Талачынскі, Бешанковіцкі, Сіроцінскі і Расонскі раёны зрываюць выкананьне пляну ільназагатовак

Дрыса на шляху да перамогі

ДРЫСА. (Наш кар.). Раён за апошнюю дэкаду дабіўся значных посьпехаў у выкананьні важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній. Плян збожжазагатовак выкананы на 117 проц. Плян загатовак мяса перавыкананы на 13 проц.

На 1 студзеня плян ільназагатовак выкананы на 80,2 проц. Дырэктыва ЦК КП(б)Б ажыцьцёўлена.

Гэтых посьпехаў райпартарганізацыя дабілася ў выніку бязьлітаснай барацьбы з кулацкім сабатажам, мабілізацыі актыўнасьці партыйна-камсамольскіх сіл і ўсёй грамадзкасьці раёну.

Увесь раённы партыйна-камсамольскі актыў кінут на раён і прымацаваны да сельсаветаў, непасрэдна да пасобных вёсак і калгасаў.

У самым адстаным **Каркалецкім** сельсавеце працае выязная брыгада раённай газэты «Зьвязда на рубяжы».

Сыстэматычна выяжджае ў сельсаветы партрэйка РКК КП(б)Б, якая на месцы разглядае справы і рашуча ачышчае пэўтыйныя рады ад усіх кулацкіх агентаў і перараджэнцаў.

Гэтымі днямі па сьпісках выязной рэйкі быў выключан з партыі былы старшыня Каркалецкага сельсавету Кулічэнак, які на здолеў мабілізаваць масы па барацьбу з кулацтвам і па насьпіхоўце провядзеньне загатовак. Выключан з партыі і аддан пад суд перараджэнец **Хахель,** які, займаючы пасаду інструктара Беркавіцкай МТС, трымаў цесную сувязь з кулаком Булаўскім з в. Стайкі.

Кулак Булаўскі ня здаў ніводнага кілёграму збожжа і ільну па цьвёрдых заданьнях, ён схаваў лён у яму і праводзіў контрэвалюцыйную работу сярод вакольных аднаасобнікаў па зрыве загатовак.

Калі гэты лёны клясавы вораг апынуўся на лаўцы падсудных, Хахель выступаючы на судзе ў якасьці сьведкі, абараняў яго.

Прыезд у раён намесьніка старшыні СНК БССР тав. Бэнэка 27 сьнежня выканаў вялікае нарастаньне тэмпаў ільназагатовак. За 6 дзён — з 25 сьнежня па 1 студзеня — прырост складае 20 проц. гадавога пляну ільназагатовак і па 12 проц. дасягнуў прыросту толькі за апошнія два дні 30 і 31 сьнежня.

Налажана круглясутачнае дэжурства ў РК КП(б)Б і сельсаветах; круглясутачная перавозка і здача ільнатрасты на заводы.

Пераможкамі ў выкананьні пляну ільназагатовак зьяўляюцца калгасы «Саўспаборніцтва», імя Варкапылава, «1 мая», «Камунар», «Шлях Леніна», «Полымя рэвалюцыі» і інш. якія ня толькі выканалі, але і перавыкапалі плян здачы ільнапрадукцыі.

Росічкі сельсавет першым выканаў плян апрацоўкі і здачы валакна.

Дрысенская райпартарганізацыя не павінна здаваць тэмпаў, а яшчэ больш узмацніць іх, каб завяршыць ільназагатоўкі ў самыя бліжэйшыя дні.

М. Л.

Лён—самы адсталы вучастак крычаўскай партарганізацыі

КРЫЧАЎ. (Наш кар.). Каб паскорыць тэмпы ільназагатовак, раённы камітэт партыі прапанаваў сельсаветам і партыйным ячэйкам перавесьці сушыльныя і ільнамяльныя пункты на тры зьмены і забясьпечыць работу пастаянных вытворчых брыгад па пераапрацоўцы ільну.

Але даўшы зусім правільную ўстаноўку, райком сам пра яе забыў. Кантролю выкананьня гэтай дырэктывы ня было.

У гэтым заключаецца галоўная прычына таго, што калгасы **Крычаўскага** раёну на 2 студзеня плян здачы ільнавалакна выканалі ўсяго на 62,3 проц. З-за дрэннага скарыстаньня самых несклаканых прылад, якія паскараюць пераапрацоўку ільну, большасьць калгасаў ганебна зацягнулі выкананьне сваіх абавязкаў перад дзяржавай.

Ёсьць і такія кіраўнікі калгасаў, якія сьвядома сабатуюць хутчэйшае выкананьне ільназагатовак. Напрыклад, калгас **«Парыская камуна»,** Кашанскага сельсавету, ня здаў дзяржаве ні фунта валакна. Між тым, у гэтым калгасе ляжыць 35 вазоў неапрацаванай ільнатрасты. Палова яе ўжо прышла ў непрыгоднасьць. **Старшыня калгасу Іванаў стаў на шлях ШКОДНІЦТВА.** Гэты кулацкі агент нічога ня робіць для таго, каб апрацаваць астатнюю частку ільну, не пасылае на пераапрацоўку яго ні аднаго чалавека.

У калгасе **«Чырвоны прамень»,** Бельскага сельсавету, было засеяна 19 га ільну. Ураджай атрыманы вышэй сярэдняга. Па загатоўках «Чырвоны прамень» павінен здаць дзяржаве 20 цэнт. валакна, здана 2 пуды. Тлумачыцца гэта выключна дрэннай арганізацыяй пераапрацоўкі ільнатрасты. Пастаянныя брыгады ў калгасе не створаны. З 27 працаздольных жанчын на пераапрацоўку ільну выходзіць толькі 3-5. 2 конныя прыводы і мялкі поўнасьцю не загружаны.

Ня лепш справа і ў буйнейшым калгасе «Шлях да сацыялізму». Сушыльні скарыстоўваюцца на 50 проц. Жанчыны працуюць ня больш 3-4 гадзін у суткі, бо не хапае ільнатрасты. Плян здачы валакна выкананы на 38 проц.

Партыйная ячэйка і Баеўскі сельсавет некалькі разоў папярэджвалі праўленьне калгасу **«Чырвоны барацьбіт»** і яго старшыню камуніста **Бабея** аб тым, што трэба неадкладна пераапрацаваць лён і выканаць плян загатовак. Але Бабей на папярэджаньні не зварачае ніякай увагі.

— Я гаспадар і мне ніхто ня можа ўказваць,—са зрэдкаю адказвае калгасьнікам Бабей.

У калгасе «Чырвоны барацьбіт» была накіравана брыгада з лепшых ударнікаў суседніх перадавых калгасаў для дапамогі ў пераапрацоўцы ільну. Прыбыўшы на месца, брыгада ў калгасе не знайшла трасты.

Куды-ж дзелася сотні пудоў трасты?

Аказваецца, што ўсю трасту Бабей выкарыстаў на подсьціл коровам. Як гэта ня дзіўна, але Бабей—адкрыты кулацкі агент, вораг рабочае класы—з партыі ня выкінут і з работы ня зьнят.

Яшчэ горш праходзяць загатоўкі па аднаасобным сэктары, які выканаў плян здачы ільнавалакна на 43,2 проц. Больш за ўсё адстаюць Бацьвінаўскі, Зарубецкі, Бельскі і Кашанскі сельсаветы. Адставаньне аднаасобнага сэктару—вынік зусім слабай барацьбы з кулацкім сабатажам, вынік слабага націску на кулацка-заможныя гаспадаркі і дэмабілізацыйных настрояў брыгад РК і РВК у гэтых сельсаветах. Брыгады ня здолелі спалучыць ударнага правядзеньня збожжазагатовак з ільназагатоўкамі. Дабіўшыся завяршэньня збожжазагатовак, брыгады спынілі сваю работу.

На фоне гэтых фактаў становіцца зусім зразумелым, чаму Крычаўскі раён на 2 студзеня здаў толькі 58,1 проц. ільнавалакна.

Ільназагатоўкі зараз самы адсталы вучастак у рабоце крычаўскай партарганізацыі. Райком партыі павінен зараз з бальшавіцкай напорыстасьцю ўзяцца за выкананьне загатовак тэхнічных культур.

Рашучым націскам на кулака, ачышчэньнем партыйных радоў ад кулацкіх агентаў, пры шырокай масава-растлумачальнай рабоце крычаўская партарганізацыя заваюе перамогу ў бліжэйшыя дні на фронце ільназагатовак.

Ал. Ольскі.

Кулак у калгасах Гарадокшчыны

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Гарадоцкая МТС абслугоўвае 68 калгасаў. Усе яны з ільнарошча-малочным ухілам. МТС мае армію спэцыялістаў, агрэномаў, загадчыкаў вытворчых вучасткаў, разьязных мэханікаў і г. д. Ня гледзячы на гэта, калгасы, якія абслугоўваюцца МТС, на 1 студзеня выканалі плян ільназагатовак толькі па 57,8 проц.

Прычынай такога становішча зьяўляецца тое, што Гарадоцкая МТС ня стала арганізатарам пераапрацоўкі ільну, не вяла барацьбы са спажывацкімі тэндэнцыямі і кулацкім сабатажам у пасобных калгасах.

Возьмем калгас **«Другая бальшавіцкая вясна».** Старшынёй праўленьня ў гэты калгас пралез **былы эсэр Сьляпцоў,** які раней меў 25 га зямлі. Калгас засеў 36 га ільну. Лён быў сярэдняга ўраджаю. І вось старшыня калгасу, кулак Сьляпцоў пускаецца на наступны манэўр: свайму прыяцелю аграному МТС Блыжэвічу ён заяўляе, што лён загінуў. Блыжэвіч выяжджае на месца і складае фальшывы акт аб тым, што 18 гэкт. ільну зусім загінулі, а рэшта пашкоджана часткова. Гэты фальшывы акт падвёс фінспэктар і калгас атрымлівае страхоўку.

Агранам Блыжэвіч і зараз працуе ў МТС, прапагаваючы сваю шкодніцкую дзейнасьць.

Або возьмем калгас **«Зара Леніна»,** Кабашчанскага сельсавету. Старшынёй яго быў кулак **Стасеў,** які раней меў 55 га зямлі. Калгасу паводле пляну трэба было засеяць 22 га ільну. Фактычна-ж засеялі 12 га. У справаздачнасьці праўленьне паказвае, што засеяна 22 га. Насеньне, якое засталося, было разбазарана. Кулак Стасеў, бачачы, што ашуканства яму ўдалося, робіць тое-ж самае і ў асеньняю пасеўную кампанію. Замест 26 га жыта засяваецца 18 га, у справаздачнасьці зноў паказваецца, што засеяна 26 га. Насеньне-ж таксама разбазарваецца.

Калгас нявыканаў пляну загатовак. Ільна валакна здана 21 проц., а ільнапрыгодных семя — 37 проц.

Гэтыя яўна контр-рэвалюцыйныя манэўры кулацкіх элементаў былі накіраваны на зрыў загатовак, на разбурэньне калгасаў з сярэдзіны.

Кулацкі сабатаж і шкодніцтва сталі магчымымі толькі таму, што дырэкцыя МТС і партыйная ячэйка бязьдзейнічалі, адарваліся ад калгасных мас і не кіравалі калгасамі, страцілі клясавую пільнасьць.

МТС не арганізавала пераапрацоўкі ільну ў калгасах. Мяльна-сушыльныя пункты працуюць з вялікімі перабоямі, усяго па 6-7 гадз. у суткі.

Партарганізацыя павінна зараз-жа праверыць склад работнікаў МТС, ачысьціўшы яе ад клясава-варожых элементаў і іх агентаў.

Ул. Мачальскі.

Упакоўка ільнянога валакна на загатпункце.

Агідныя адносіны да ільназдатчыкаў

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

«Зьвязда» паведамляла ўжо аб фактах зрыву ільназагатовак кіраўнёком сіроцінскай канторы Загатільну, які зьнят з работы.

Другога кіраўніка яшчэ няма, у дапамогу канторы з Менску прыбылі намесьнік Белзагатільну т. **Пінхасін** і загадчык арганізацыйна-масавага сэктару т. **Ерушкоў.**

Апошнія дні адзначаюцца павышэньнем тэмпаў ільназагатовак. На прыёмачныя пункты ўвесь час істужкай цягнуцца фурманкі з валакном і трастой.

Але загатоўчыя пункты ў Сіроцінскім раёне працуюць па-ранейшаму вельмі дрэнна. Склады загатільну ў Шумяліне забіты валакном. Увесь двор таксама заняты ільна прадукцыяй, няма ўжо дзе павярнуцца з фурманкай.

Лён ляжыць пад адкрытым небам, пры зьмене патвор'я ён можа папсавацца. Кантора Загатільну ня ўжывае мер для ўзмацненьня ўпакоўкі валакна і адгрузкі яго.

У **Вобалі** таксама ёсьць пункт Загатільну. Тут чарэз за атрыманьнем квітанцый. Ніяк не маглі дагадацца пасадзіць на гэту справу некалькі лішніх людзей, мабілізаваць на некаторы час камсамольцаў.

Прыёмшчыкі вобальскага пункту часамі наўмысьля зьніжаюць якасьць валакна. Вось характэрны выпадак, які адбыўся 30 сьнежня.

Аднаасобнік Лявонцьцеў здаваў 4 кгр. валакна, якое прыёмшчык **Дзяжураў** залічыў чацьвертым нумарам. Лявонцьцеў пачаў пярэчыць: «вы-ж мне такі самы лён некалькі дзён таму назад залічылі ў шосты нумар». Дзяжураў і слухаць ня хоча, але дзядзька Лявонцьцеў не адступае.

Умешваецца другі спэцыяліст—Бройдэ.

— Можна залічыць у шосты,—гаворыць ён і з іронілі дадае: «трэба часамі і селяніну зрабіць уступку».

Гэта адзін прыклад, а колькі такіх несаўважаных.

Прыёмшчыкі для самастрахоўкі зьніжаюць якасьць валакна. У Вобалі ёсьць і ільназавод. Тут з прыёмкай трасты яшчэ горш. Дзяжурствы на працяту дня і ночы не арганізаваны. У выніку ільназдатчыкі часта прымушаны чакаць гадзінамі.

29 сьнежня 5 фурманак з трастой з калгасу «Новае жыцьцё» і імя Тэльмана прыехалі за 20 клм. на ільназавод а 7 гадзіне ўвечары. На заводзе прыёмшчыка не аказалася. Калгасьнікі прымушаны былі пачаваць. На заўтра раніцою прыёмшчыка таксама няма, нарэшце а 11 гадзіне дня зьявіўся сам... дырэктар і прыняў трасту.

У такі напружаны момант, калі ўсе сілы і сродкі мабілізаваны на хутчэйшае выкананьне ільназагатовак, нельга больш цярпець такіх агідных адносін бюракратаў да ільназдатчыкаў.

Б. Харытончык.

Чорная дошка

Пастановай СНК БССР і ЦК КП(б)Б занесены на чорную дошку наступныя раёны і сельсаветы:

Раёны:

1. Талачынскі, 2. Горацкі, 3. Кармянскі, 4. Дубровенскі, 5. Асьвейскі, 6. Чавускі, 7. Сеньненскі.

Сельсаветы:

па **Чачэрскім раёне:** Глыбачанскі,
па **Буда-Кашалеўскім:** Нядальскі, Патапаўскі і Губіцкі,
па **Менскім раёне:** Папярнянскі,
па **Віцебскім:** Старасельскі і Руданоўскі,
па **Сеньненскім:** Машчонскі і Алексінскі,
па **Дзяржынскім:** в. в. Станкава, Каменка і Шатаноўшчына,
па **Пятрыкоўскім раёне:** Асавецкі і Піцкі
па **Клімавіцкім раёне:** Красавіцкі сельсавет,
па **Лепельскім раёне:** Ляхаўскі сельсавет і вёскі Бабіна, Круглацы і Сталбцы,
па **Чэрыкаўскім раёне:** Каменскі сельсавет,
па **Бягомльскім раёне:** Дамаржыцкі сельсавет,
па **Чавускім раёне:** Праздкоўскі, Рабуўскі і Дзеднаўскі,
па **Лагойскім раёне:** Гайнінскі,
па **Нараўлянскім раёне:** Мухаедаўскі, Хаткоўскі,
па **Чашніцкім раёне:** Ульянавіцкі,
па **Магілеўскім раёне:** Бышаўскі, Хонаўскі, Рафалаўскі, Гусьпішчанскі,
па **Сіроцінскім:** Заранаўскі і Мішкаўскі,
па **Клічаўскім:** Віркаўскі, Грыбавецкі, Даўжанскі і Дубеньскі,
па **Сураснім:** Камароўскі і Войтаўскі,
па **Аршанскім:** Буеўскі,
па **Пухавіцкім:** Гарэліцкі, Слабодзкі, Задашчанскі і Шацкі,
па **Вушацкім раёне:** Чаранаўшынскі і Усайскі сельсаветы,
па **Крычаўскім:** Цяшанскі сельсавет,
па **Дрысенскім раёне:** Юзэфоўскі і Каркалеўскі.

МАНЭЎР НЯ ЎДАЎСЯ

Дзесяты раз шумеў сход у в. **Блізьніцы.** Дзесяты раз абмяркоўвалі плян ільназагатовак.

Плян па вёсцы невялічкі—110 кгр., і той ніяк ня выкопваецца.

— Пяма ільну, дый годзе!—крычаць у адзін голас блізьніцы.

Што і гаварыць, дружны народ, з'арганізаваны, ды, на жаль, з'арганізаваны не парт'ячэйкай, а кулаком.

На сходзе, як водзіцца, выбралі прэзыдыум. Старшынёй запрасілі гр. **Кошка.** Чалавек ён паважны: лясьнік, член саюзу рабземлес, сын настаўнікам працуе.

Шумеў сход у в. Блізьніцы... Гаварылі прадстаўнікі з раёну: першая пяцігодка скончана з посьпехам. Пераможна ўступаем у другую. Краіна патрабуе сырцу, ільну. Вёсцы патрэбен шырэнажыў...

Гаварылі шмат і пераканаўча.

Удзельнікі сходу слухалі і маўчалі, часамі пазіраючы на старшыню сходу Кошка. Чакалі, што ён скажа.

Нарэшце, загаварыў і Кошка.

— Мілыя людцы! Лянок дзяржаве патрэбен—гэта так. Трэба даць. Але-ж, мілыя прадстаўнічкі, не ўраджэй у нас лянок. Вось сабе на кашульку трэба было-б спрасьці хунік-другі, але лянку... кот наплакаў. Што ёсьць, тое трэба і даць, мілыя людцы!—закончыў старшыня.

Гаварыць, агітаваць ужо ня было чаго. Пытаньне ставілі проста:

— Колькі можаш здаць Максім?

— Ніколькі, няма.

— Пятрок, колькі здасі?

— Ніколькі, няма.

— Старшыня сходу Кошка, а колькі ты здасі?

—Казаў-жа я, што няма лянку, але як-небудзь ужо наскрабу дзесятак хунтаў. Усё-ж актывіст я, член саюзу, прыклад трэба паказаць.

Жонка Кошкі і па гэта пярэчыла:

— Ня можам здаць і 10 хунтаў. Ня ведаеш, што гаворыш, стары пень,—сішела яна на свайго дзеда.

Пакуль сход абмяркоўваў плян ільназагатовак у 110 кгр., прадстаўнік з раёну т. **Ціцкоў** і мясцовы грамадзянін клікнулі жонку старшыні сходу Кошкі і запрапанавалі прайсьціся разам. Пайшлі да яе ў хату. Папрасілі паказаць лён, што «кот наплакаў». Палезьлі на гару.

І што-ж, на гары ляжаў чысьценькі, бліскучы, чосаны, лён фунтаў 30.

— Больш няма,—клялася і божылася жонка «актывіста» Кошкі, які старшынствааў на сходзе.

Не паверылі. Узялі лён, каб паказаць на сходзе. Палезьлі ўніз, спатыкнуліся на кашоўку. Пад кашоўкай у сенцах аказаўся... лён. Чысты, трапаны, 2½ пуды. Забралі і гэты, пайшлі назад, проста на сход. Прыйшлі і палажылі на стол перад самым носам старшыні.

— Тры пуды 10 фунтаў ільну або 52 кгр. Палова нашага пляну па ільнавалакне ў аднаго Кошкі,—коратка і ясна далажылі сходу таварышы, якія на момант адлучыліся з хаты.

Так быў выкрыт падкулачнік, арганізатар кулацкага сабатажу ў в. Блізьніцы, член прафсаюзу Кошка.

Інакш загаварыў пасьля гэтага сход. Плян быў прынят з перавышэньнем на 50 проц. І ня толькі прынят, але назаўтра-ж выканан. Весткі аб гэтым факце выкрыцьця кулацкага агента хутка разьнесьліся па ўсім сельсавеце.

Выкрываючы кулацкіх агентаў, працоўныя аднаасобнікі ўзьнімалі тэмпы здачы ільну. За два дні здалі 60 проц. гадавога пляну.

А. М.

Варэнецкі сельсавет, Полацкага раёну.

Японскія выдатныя палітыкі—за заключэньне пакту аб ненападзе з СССР

ТОКІО, 6. Газэта «Хоці Сімбун» паведамляе аб канфэрэнцыі, скліканай па ініцыятыве газэты і прысьвечанай абмеркаваньню міжнароднага становішча Японіі. На канфэрэнцыі прымалі ўдзел важнейшыя спэцыялісты па пытаньнях замежнай палітыкі, у тым ліку Іосізава (был. міністар замежных спраў), Яматава і Ашыда (парляманцкі дэпутат партыі Сэйюка). Канфэрэнцыя сканцэнтравала сваю ўвагу на абгаварэньні савецка-японскіх адносін.

Ашыда, які заняў з 1-га студзеня т. г. пост галоўнага кіраўніка газэты «Джапан Таймс», рашуча выказваўся за заключэньне пакту паміж Японіяй і СССР, заявіўшы, што гэта быў-бы першы крок актыўнай замежнай палітыкі Японіі, накіраванай да зьнішчэньня дыпляматычнай ізаляцыі Японіі, узьнікшай у результаце акупацыі Манчжурыі. Ашыда падкрэсьліў, што як ПАЗШ, так і СССР ня могуць «не адносіцца з падазрэньнем да палітыкі Японіі, пакуль не атрымаюць канкрэтных доказаў аб межах яе кантрэнтальнай палітыкі». Калі Японія пядвузначна заяўляе, што яна абмяжоўваецца прылажэньнем сваіх сіл да Манчжурыі, то паводле думкі Ашыда некалькі ўскладнішыя ў не газэты і прысьвечанай абмеркаваньню міжнароднага становішча Японіі. На канфэрэнцыі прымалі ўдзел важнейшыя спэцыялісты па пытаньнях замежнай палітыкі, у тым ліку Іосізава (был. міністар замежных спраў), Яматава і Ашыда (парляманцкі дэпутат партыі Сэйюка). Канфэрэнцыя сканцэнтравала сваю ўвагу на абгаварэньні савецка-японскіх адносін.

Закранаючы пытаньне аб савецкай прапанове заключыць пакт аб ненападзе, Ашыда заявіў: «Непажадана, каб Японія праяўляла нерашучасьць у дадным пытаньні. Японія, будучы ўдзельніцай пакту Келёга, абяцалася не ваяваць з СССР, а таму заключэньне пакту аб ненападзе не ўскладае ніякіх дадатковых абавязацельстваў на Японію і не пазбаўляе яе ніякіх правоў. Калі СССР жадае заключыць пакт, Японіі няма чаго хістацца, бо яна нічога ня страціць, заключыўшы пакт без усякіх агаворак».

У заключэньне Ашыда заявіў: «Пакуль Японія не запэўніць савецкі ўрад, што яна будзе паважаць і поўнасьцю захоўваць правы і інтарэсы СССР, яна ня можа спадзявацца на зьнішчэньне падазрэньняў з боку СССР у адносінах да Японіі».

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

НЕ ПАЗЬНЕЙ 15 СТУДЗЕНЯ ЗАВЯРШЫЦЬ БУЛЬБАЗАГАТОЎКІ

ДА КАНЦА ЗЛАМАЦЬ ДЭМАБІЛІЗАЦЫЙНЫЯ НАСТРОІ НА ГЭТЫМ АДКАЗНЫМ ВУЧАСТКУ ЗАГАТОВАК

ЗАГАТОЎКІ БУЛЬБЫ ПА БССР

(у процантах да гадавога пляну)

На 3 студзеня	На 4 студзеня	На 5 студзеня	На 6 студзеня
82,9	83,2	83,7	84,0

Магілеўшчына не здала 1.413 тон бульбы

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Магілеўшчына павінна загатовіць 97 тыс. тон бульбы. Раён наказаў сапраўдныя ўзоры барацьбы за адгрузку Ленінграду. За 6 дзён была адгружана выначная колькасьць бульбы.

Аднак пасьля скапчэньня адгрузкі, рабочыя арганізацыі супакоіліся і закінулі гэты вучастак работы. На 5 студзеня плян загатовак бульбы выканан па 85,4 проц., прычым адпаасобны сэктар адаў толькі 77 проц.

Большасьць партыйных ячэек і сельсаветаў ня здолелі спалучыць важнейшыя кампаніі—загатовак бульбы і збожжа і разгарнуць кулацкі сабатаж.

У радзе сельсаветаў пасьля напружанай барацьбы за збожжа наглядаюцца дэмабілізацыйныя настроі, у выніку чаго за апошнія 5 дзён тэмпы здачы бульбы значна зьлізіліся.

Рашаючыя сельсаветы Гаравскі, Мастоўкі, Навасельскі, Рафалаўскі, Палыкавіцкі асабліва адстаюць. У гэтых сельсаветах апраўдваюць позыканаьню пляну тым, што заданьне «нерэальнае». Аб тым, што гэтыя разважаньні ня вытрымліваюць ніякай крытыкі, паказвае вопыт Княжыцкага сельсавету, які ўжо перавыканаў сваё заданьне, бо ён здолеў перанесьці на загатоўкі бульбы выпрабаваныя мэтады барацьбы за збожжа.

Магілеўскаму раёну засталося здаць 1.413 тон бульбы. Гэта колькасьць павінна быць загатоўлена па працягу бліжэйшых двух-трох дзён.

Н. Н.

Кулацкі сабатаж яшчэ ня зломлен

МАЗЫР. (Наш спец. кар.). У 22 клм. ад раённага цэнтру, знаходзіцца Слабодзкі сельсавет. 867 гаспадарак сельсавету павінны здаць дзяржаве 497 цэнт. збожжа і 4.676 цэнт. бульбы.

Да 1 студзеня сельсавет выканаў плян збожжазагатовак. Аднак здача бульбы затрымлівалася і плян да 1 студзеня выканан толькі на 85,1 проц.

Кулак і яго агентура, скарыстаўшы слабасьць партыйна-камсамольскай арганізацыі, пралезьлі ў кіруючыя органы сельсавету і арганізавалі сабатаж загатовак.

Сакратар сельсавету Сітнікаў самавольна зьменшыў плян загатовак бульбы на 197 цэнт., старшыня камісіі садзейнасьці на вёсцы Касьцюковічы—Камінскі зьменшыў заданьне на 432 цэнт. Аб гэтым ведаў старшыня сельсавету Арцюшэнка, але ніякіх мер ня прыняў.

Сельсавет і партыйная ячэйка на працягу кампаніі загатовак ні разу не праверылі, як члены камісій садзейнасьці выконваюць свае заданьні. Між тым, ёсьць факты, калі члены сельсавету і камісіі садзейнасьці самі сабатавалі здачу збожжа і бульбы і былі нават вызвалены ад загатовак. Так, напрыклад, вызвалены ад здачы працкпы члены камісіі Самуіл Ільлюк і Пінавзраў. Калі запыталіся ў сакратара ячэйкі, Юшкевіча на якой падставе вызвалены яны ад загатовак, дык тав. Юшкевіч адказаў: «За ўсімі ня ўглядзеш». Такія паводзіны кіраўніка партарганізацыі толькі граюць на руку клясаваму ворагу і яго агентуры.

Партыйная і камсамольская ячэйкі не займаліся пытаньнем расстаноўкі сіл па вучастках—з 72 членаў партыі і камсамолу ў загатоўках прынае ўдзел толькі 37 чал., рэшта бязьдзейнічае.

Вальфсон.

Закінуты вучастак работы

ЕЛЬСК. Рад сельсаветаў Ельскага раёну (Багуцінкі, Роза-Люксэмбургскі, Начышчанскі) выканаць здачу бульбы. Стара-Высоцкі сельсавет выканаў плян бульбазагатовак на 111 проц.

Аднак, ёсьць сельсаветы, якія, выканаўшы плян збожжазагатовак, зусім аслабілі барацьбу за бульбу. Так, Санюкоўскі сельсавет за апошнюю пяцідзёўку не загатовіў ні адной тоны, прычым цьвёрдыя заданьні поўнасьцю не спатканы.

Члены партыі з Санюкоўскай ячэйкі Лявонаў і Братюўскі абаранялі кулацка-заможныя гаспадаркі. Пастановай бюро РК і прэзыдыуму РКК яны выключаны з партыі. Аднак, ячэйка не зрабіла належных выводаў з гэтай справы, бульбазагатоўкі ня сталі яшчэ баявой задачай арганізацыі.

Ёсьць факты, калі шляцавыя заданьні ня поўнасьцю разьмеркаваны па сельсаветах; так, да Кузьміцкага сельсавету не даведзена заданьне ў 9 тон бульбы.

Дрэнны ход загатовак бульбы па раёну (60 проц.) абавязвае мясцовыя арганізацыі перабудаваць работу і рашучым ударам па кулацкім сабатажу дабіцца поўнага выканаьня пляну ў бліжэйшыя дні.

Е—і.

Кіраўніцтва загатоўкамі не наладжана

ПЛЯШЧАНІЦЫ. (Наш кар.). Плешчаніцкі раён вылучыўся адным з адсталых у БССР па выкананьні пляну бульбазагатовак. Да гэтага часу плян выканан на 87,6 проц., прычым адпаасобны сэктар выканаў заданьне на 70 проц.

Вінна становіцца з бульбазагатоўкамі ня трэцяе раённае кіраўніцтва. Яно супакоілася на тым, што процант выкананьня пляну па раёну ня менш агульнарэспубліканскага.

У раёне аб бульбе зусім забылі. Возьмем Хатаевіцкі сельсавет. Ён выканаў заданьне на 53 проц. Парт'ячэйка і сельсавет гэтым пытаньнем не займаліся. Цьвёрдыя заданьні спатканы толькі на 28 проц. Упаўнаважаным РК па сельсавеце зьяўляецца сам сакратар РК тав. Папянкоў. Гэта сьведчыць аб тым, што раённыя арганізацыі зусім не наладзілі апэрацыйнага кіраўніцтва загатоўкамі.

Модлін.

Пра шэфаў, радыё, кіно і драмгурток

(Запіскі брыгадзіра)

У быхаўскай сталоўцы поўным-поўна сялян-хлебазадатчыкаў. Гоман і мітусьня, абуральне і сакавітая лаянка—тушкуюцца на хвалях махорачнага дыму і кухоннага чаду.

А як не абурацца? Сяляне перад ад'ездам дадому заходзяць у сталоўку, каб выпіць шклянку гарбаты. А ў сталоўцы ёсьць усяго толькі чаўры кубкі. Вось тут і канфлікт з адміністрацыяй, і чарга стараецца, і стаіць гул справядлівага абуроньня. Ці-ж магла дадумацца адміністрацыя, што хлебазадатчык наведае сталоўку? А чатырох кубкаў дагэтуль зусім ставала—у сталоўцы і ўсяго служачых ня больш чатырох душ.

Памлапаціцца аб тым, каб выканаць свае кампэрацыйныя абавязкі перад селянінам-хлебазадатчыкам, пазапрацоўнікі не пажадалі.

У Магілеве бюро РК КП(б)Б пастанавіла арганізаваць ларкі для абслугоўваньня хлебазадатчыкаў на загатпунктах. Але ні Белгандаль (Рахновіч), ні ЦРК (Файн) не патурбаваліся, каб правесьці гэту дырэктыву ў жыцьцё.

Пэрбайнасьць, бесклапотнасьць, непаваротлівасьць—характэрныя рысы многіх кампэрацыйных арганізацый.

Меліся і такія выпадкі, калі, з прычыны несвячасовай выдачы квіткоў магілеўскай канторай Загатобожжа, хлебазадатчыку даводзілася езьдзіць па 25 кілёмэтраў па некалькі раз.

Пэрыяд загатовак, як ня трэба лепш, паказаў нам наяўнасьць у некаторых установах і грамадзкіх арганізацыях чыноўнага фарналізму ў справе шэфства над калгасамі, над сельсаветамі, над паасобнымі вёскамі.

Адна з характэрнейшых рысаў сыстэмы нашай работы—гэта тое, што, праводзячы кожнае сваё мерапрыемства, мы разгортваем масавую растлумачальную работу.

Апэрацыйнай групкасьці, арганізаванасьці, разгортваньня масавай работы ў часе загатовак з боку шэфаў аніяк ня было відаць.

Ні ў водным сельскім пункце, дзе мне даводзілася працаваць, я ня сустрэў работы радыё. У некаторых хатах-чытальнях валяюцца паломаныя радыё-прыёмнікі, на сьцепах у сяёлах павуціньня вісяць забытыя, як сіроты, рэпрадуктары.

Імпараваць-жа такі магутны сродак нашай палітычнай работы, як радыё,—спакойна кажучы—палітычная бязграмотнасьць.

Дзе-ж работнікі радыё-вузлоў, дзе культасьветныя ўстановы і, зноў-жа, дзе шэфскія арганізацыі?

Затрачваюцца вялікія сродкі на радыёвяшчаньне, а радыё на вёсках маўчыць, радыё не выкарыстоўваецца ў важнейшую палітычную кампанію, калі ўся КП(б)Б на бліжавала на свячасовае і поўнае выкананьне пляну ўсіх відаў загатовак.

Мне даводзілася чуць нямала скаргаў на тое, што прайшло на году і болей, як была заглядвала ў вёскі кіно-перасоўка. А спра буйце расказаць пра гэта кіно-работнікам, яны безапэляцыйна перакінуць усю віну на дзесяткі раённых арганізацый, пералічаць дзесяткі розных кіно-прычын, затым выкажуць спачуваньне і супакояцца. А супакойвацца ім не на карысьць. Варта было-б, каб прадумалі, які палітычны калёрыт набывае іх «супакой», калі яны пастаўлены партыяй адказваць за пракат кіно-фільмаў...

Зусім амаль адсутнічае ў вёсках рух самадзейнага мастацтва. Ні камсамольскія ячэйкі, ні школы не арганізоўваюць мастацкіх вечароў; адно толькі ў больш буйных пунктах, у нарадмох часамі наездам бываюць дамэсаўскія халтуршчыкі.

І радыё, і кіно-перасоўка, і спэктакль, і просты, гарачы, зазыўны верш—зьяўляюцца вастрэйшымі сродкамі клясавай барацьбы ў руках пралетарыяту, у руках ка муністычнай партыі.

Калі па радыё тысячы вяскоўцаў пачуюць,—што з Цішоўскага сельсавету кулак Кулянноў прывёз здаваць збожжа напалову з пяском,

што ў калгасе імя Калініна, у Вэнтарскім сельсавеце, млынары Пухоўскі Міхась і Пятрусь падраблялі квіткі, раскрадалі памольны збор і спалілі дзьве калгасныя пуды,

што ў Дунаеўскім сельсавеце ў двух калгасных млынох знойдзена звыш 400 пудоў схаванага кулацкага хлеба, —

няўжо гэтыя факты дзейнасьці нашага клясавага ворага ня прымусяць вышэй узьняць клясавую пільнасьць вясковага актыву? Няўжо не абудзяць яшчэ большай нянавісьці да кулака і няўжо ня ўзьнікне неабходнасьць стварэньня пралетарскага дазору на прыймовых загатпунктах?

Усе гэтыя факты барацьбы можна азлобіць жывою, лёгкаю да ўспрыйманьня, форматай і гэтым самым радыё-работнікам дзейна ўключыцца ў барацьбу з кулаком і яго набраніцамі, суб'ектам з партбілетам, буржуазным перараджэнцам.

А барацьба з імі павінна быць бязьлітаснай і рашучай.

Чаму нельга радыё-фэльетонам, сатырай, прыпеўкамі, або меткімі кадрамі кіно-часопісі, або вострым скетчам—паказаць тыш Старавойтава—старшыні калгасу «Дыктатура працы», які, хаваючы ў камізэльцы партбілет, адначасова ў сваім гумне хаваў 500 пудоў кулацкага хлеба. Можна і пра справы, зробленыя з «благаславеныя кіраўніцтва» (Бялевіцкі сельсавет), дзе кулакі, пралезшы ў камсод, Вользе Куновай, якая мае два га зямлі, далі норму здачы хлеба ў шэсьць разоў большую, чым свайму прыяцелю Маргунову П., які мае 14,5 га зямлі. Альбо пра старшыню Рафалаўскага сельсавету Вараб'ёва, які замест разгортваньня змаганьня за загатоўкі, ходзіць паляваць на зайцоў, а яго «неадмены» сакратар Баскоўскі кожны дзень пад бубнаў звон ладзіць хмель-вечарынкі.

Масавыя віды мастацтва павінны па-сапраўднаму ўключыцца ў бальшавіцкую масавую работу, змагаючыся з кантрабандай халтуршчыкаў, якія сваёй «прадукцыяй» спрыяюць нашаму клясаваму ворагу.

Мы маем цэлы рад бліскучых узораў палітычных посьпехаў, дасягнутых на аснове правільнай пастаноўкі масавай работы.

За тое, што прымушаюць у сваёй сталоўцы абварвацца гарачай гарбатай людзей ад сьпецнага «пітня» (бо за кожным з чатырох кубкаў па дваццаць чалавек у чарзе), быхаўскіх снабработнікаў можна трэсным, сакавітым мастацкім сродкам так «абварыць», што паслужыць надоўга навукай многім і многім другім. І гэта вікольні ня зьнізіць ролі і сутнасьці радыё-фэльетону, або эфэктыўнасьці кіно-часопісі, або мабілізуючай змацняльнай сілы паказу драмгуртка, або характару дзелавой дапамогі шэфарганізацый у справе разгортваньня культмасавай работы на вёсцы.

Андрэй Аленсандровіч.

Магілеў.



Ніці ідэалёгічнага сваяцтва

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Дзень папярэдадні завяршэньня збожжазагатовак быў поўны напружанай работы ва ўсіх сельскіх саветах Жлобінчыны. На месца выехала больш 120 работнікаў. Шырока разгарнулася растлумачэньне пастановы ЦК аб загатоўках, даведзена да мас пастанова ЦКК аб выключэньні з партыі перараджэнца Жыракова.

У пракураным пакойчыку сакратара райкому бесьперапынна звоніць тэлефон. Ён змаўкае толькі тады, калі пачынаюць сьпяваць першыя пеўні. Старшыні сельсаветаў, упаўнаважаныя, кіраўнікі загатоўчых кантор перадаюць лічбы і процанты выкананьня пляну. Зводка—шлях бальшавіцкай работы—паказвае 97.2 проц. на 2 студзеня. Тэмпін ня вытрыман. Толькі 7 сельсаветаў дасягнулі 100 проц. Стрэшанскі, Малевіцкі, Кабакоўскі, Бабоўскі, В.-Албінскі, Затонскі і Бухарынскі сельсаветы першымі ў раёне завяршылі збожжазагатоўчы плян. Але не яны вырашаюць справу. Вырашаюць якраз тыя, што адзначаны апошнімі нумарамі апэрацыйнай зводкі. Заданьні Лукаўскага, Казіміраўскага, Майскага, Сепажаткаўскага сельсаветаў у два і больш разы перавышаюць пляны перадавікоў.

Вось аб гэтых рашаючых сёньня і гутарка. Тым больш, што назвы гэтых сельсаветаў ужо фігуравалі на старонках «Зьвязды». Ад Малевіцкага, Сепажаткаўскага, Казіміраўскага сельсаветаў вялі ніці сваяцтва ў габінэт райкому, да былога сакратара Жыракова. І гэтыя сваяцкія ніці, як вядома, набылі зусім выразную форму абароны ворагаў савецкай улады—кулакоў-спэкулянтаў Міхайлоўскіх. Але ніці ідэалёгічнага сваяцтва, ніці кулацкай работы цягнуліся далёка за межы паказаных сельсаветаў, яны спляталіся ў моцны клубок сумеснай варожай дзейнасьці кулакоў і іх агентаў—ворагаў з партбілетамі ў кішэні, кіраўнікоў сельсаветаў, стаўленікаў Жыракова.

У Майскім сельсавеце, які мае, бадай, самы вялікі плян па раёну, загатоўкі ішлі вельмі туга. Нарастаньне было настолькі мізэрным, процант так марудна ўзьнімаўся ўгару, што да 25 сьнежня ён ледзь дасягнуў 78 па збожжы і 27.8 па ільну. Варта было райкому зацікавіцца становішчам рэчаў, праверыць работу сельсавету, як перад ім разгарнулася папарама адкрытага кулацкага сабатажу, упачаленага кіраўніцтвам партыйнай ячэйкі і сельсавету.

Старшыня сельсавету Гаспадаранка, не бяз ведама сакратара ячэйкі Зубава, зьменшыў плян загатовак па радзе вёсак. На вёсцы Антопаўка плян, напрыклад, зьменшан з 98 цэнт. збожжа да 22, па в. М. Казловічы—на 8 цэнт. і г. д. Гэта ў той час, калі паказаныя вёскі прынялі плян у больших разьмерах. Па в. Малыя Казловічы Гаспадаранка даў зусім маленькія заданьні кулацка-заможным гаспадаркам. Ён тлумачыць гэта па-свойму: «у раёне М. Казловіч ёсьць прыгарадная гаспадарка спажыўтаварыства, трэба даць ёй заданьне, а за яе кошт каму-небудзь зьменшыць плян».

Затое гэты брудны кулацкі служка, затадамі зьверху даводзіў заведама непасільныя заданьні да бяднацкіх дваро. Па распарадканьні Гаспадаранка ад адпаразовага падатку вызваляюцца заможнікі Берашкоў, Басіён, а бяднячка Котава абкладаецца ў разьмеры 150 проц. Бяднацкай гаспадарцы Дзянісіка Даніла прапануецца здаць 5 пудоў збожжа, Котаву—12 пудоў, а для давядзеньня заданьняў «кулацка-заможных гаспадарак няма». Зараз гэтыя гаспадаркі знойдзены: 15 кулакоў і заможнікаў атрымалі цьвёрдыя заданьні. Атрымаў па заслугах кулацкі стаўленік Гаспадаранка і перараджэнец Зубаў.

Усьлед за Майскім сельсаветам райкому прыйшлося разматваць казіміраўскі кулацкі клубок. Для большай яснасьці напомнім, што Казіміраўскі сельсавет карыстаўся асаблівай увагай Жыракова. Ён часта заяжджаў сюды. Для яго заўсёды былі шырока адкрыты дзьверы хаты бандыта Яворскага. Яворскага-ж поўнасьцю, разам з іншымі, стаіць пад заявай аб абвінавачэньні ў правых кулакоў-спэкулянтаў Міхайлоўскіх.

Старшыня Казіміраўскага сельсавету Літвінка абураецца «ўчынкам партыі над Жыраковым»:

«Ён цэлым наш хлопец».

Не спрачаемся, дый ня гэта зараз важна. Важна, што Літвінка і іншыя кіраўнікі сельсавету таксама «свае людзі». Свае для кулака, для сабатажніка загатовак, для ворагаў савецкай улады.

Вось іх работа. На 20 сьнежня Казіміраўскі сельсавет выканаў толькі 30 проц. пляну збожжазагатовак. Чаго большага можна было чакаць ад кулацкіх заправіл? Літвінка адкрыта прызнаецца: «Сэрца не дазваляе з кулакоў спаганяць цьвёрдыя заданьні». Затое гэтае-ж «сэрца» прадыктавала Літвінку разьвярстаць толькі 30 проц. пляну загатовак, прынятага вёскай Малявіцкая Рудня. Сам старшыня і яго сакратар Верамейчык, будучы заможнікамі, ня здалі ні аднаго кілё. Іх мэта—сарваць плян дзяржаўных загатовак, разбурыць калгасы. Для гэтага старшынёю калгасу «Чырвоны камунар» пасадзілі кандыдата партыі Кушнера, які поўнасьцю апраўдаў кулацкія надзеі. Кушнер ня думаў аб загатоўках, бо «калгас нічога ня можа здаць, ён бедны». Кушнер зьвязаўся са спэкулянтамі Мэеровічам і Партніцкім і пачаў вывазку бульбы, яблык па рынкі гарадоў Украіны. У гэты-ж калгас, паводле прапановы Літвінка і рэкамэндацыі Кушнера, прынят кулак Бартніцкі Язэп. Калгасьнікі бяднякі—Рулюўскі і Гаўрыльчык яшчэ маюць на сабе сьляды кулацкіх прыгнётваньняў—сінякі, нанесеныя разьюшаным ворагам Бартніцкім. Карыстаючыся давер'ем старшыні, Бартніцкі ноччу звозіў з поля калгасную бульбу ў свой сьвіран. У калгасе выяўлена растрата на суму 2.000 руб.

Ня дзіва пасьля гэтага, што сход калгасьнікаў, на якім была ўскрыта ўся дзейнасьць кулацкіх заправіл, насіў пазычайны характар. Па радасна ўзбуджаных тварах калгасьнікаў можна было прачытаць, як далёка зайшлі зьдзелы кулацкай шайкі.

Аб другім калгасе гэтага сельсавету, калгасе імя М. Горкага, даволі сказаць, што ён складаецца з 13 гаспадарак, куды ўваходзіць 7 цьвёрдазаданьнікаў, 5 серадзякоў і адзін бядняк. У склад праўленьня тры члены, з іх два цьвёрдазаданьнікі. За апошнія дні ў калгасе разбазарана болей за 1.000 кгр. збожжа.

Ніці кулацкага сабатажу зараз выкрыты. Сабатаж разгромлен, але вынікі работы кулацтва яшчэ засталіся.

Асобна трэба спыніцца на дабрагошчанскай справе. У дзейнасьці сельсавету і парт ячэйкі, як у фокусе, відаць тое, што мы на зываем зрастаньнем з клясавым ворагам. Па формах, характару кулацкай работы, заправілы Дабрагошчанскага сельсавету — Халецкі (былы старшыня), Брушко (сакратар ячэйкі), Крышнеў Пятро, Стукач—далёка абагналі сваіх субратоў з Казіміравы і Майску.

Хто яны ў мінулым? Халецкі зараз мае 18 га пахаці, яго сакратар Зяроўскі пазбаўлен выбарчых правоў, як кулак, меў 45 га зямлі, памесьнік старшыні сельсавету Старасека Каця да рэвалюцыі мела 30 га зямлі; член сельсавету Мазгоў Паўла меў 40 га зямлі, зараз 18; Крышнеў Пятро —40 га зямлі, займаўся гандлярствам; Стукач Лаўрэн да 1926 г. меў 30 га зямлі. Вось твар кіраўнікоў сельсавету. Няма нічога дзіўнага, што за гэтай хвалай кулацка хабры, простыя пакражы, прысвойваньні соцень пудоў збожжа, мукі і інш.

Дзейнасьць іх пачалася са зьмяншэньня пляну па сельсавеце на 5 тон. Гэты паменшаны плян красуецца на сьцяне нашага сельсавету. Да вёсак-жа даведзен яшчэ меншы плян (менш на 3 тоны), пераважна за лік вызваленьня ад цьвёрдых заданьняў кулацка-заможных гаспадарак.

Па літасьці сельсавету з 34 гаспадарак былі зьняты цьвёрдыя заданьні, што ў пераводзе на збожжа азначае 6.650 кгр.

Зараз кулацкія стаўленікі злоўлены. Іх месца на лаве падсудных.

Шырока разгорнутая работа ў масах, бальшавіцкая непрымірымасьць, з якой зараз жлобінская партарганізацыя на чале з новым кіраўніцтвам змагаецца за збожжа, далі магчымасьць выкрыць і разбіць гаёды кулацкага сабатажу.

Зараз зьнята з работы 8 старшынь сельсаветаў за кулацкі сабатаж. Выключаны з партыі рад сакратароў ячэек КП(б)Б.

Гэтымі днямі зьбіраецца пленум Жлобінскага райкому КП(б)Б. Пленум павінен надаць максымум увагі ўмацаваньню вясковых ячэек і сельсаветаў партыйна-вытрыманымі бальшавіцкімі кадрамі.

В. Самуцін.

Жлобін.

Ноч перад новым годам

«Партыя ўзмацоўваецца тым, што ачышчае сябе ад апартуністычных элемэнтаў» (Сталін).

Маленна з грукатам пранеслася па закавулках вёскі, яшчэ раз бліснула ліхтаром на сонным загуменьні, спынілася ля хаты на рагу.

Сярэд цьмяных вокнаў касым дождзьчыкам ляжа сьвятло. У вокнах мільгацелі сілуэты людзей. З адчыненых дзьвярэй цыхкае нахарачным дымам і тэй гарачынёй, якая сустрэць бывае, калі сход зацягваецца.

Новы год яны сустрэлі ў дымнай хаце Паселіцкага сельсавету.

На сходзе сядзела вызная партыйная хойніцкай РКК. У хаце, перапоўненай і дымнай, вялася справа сакратара парт'ячэйкі Карася, старшыні калгасу Ціхага, старшыні сельсавету-ўпаўнаважанага Пінчука і двух камуністаў — членаў сельсавету. Справа — аб зрыве загатовак і дзеяньнях кулацкіх агентаў, якія прабраліся ў партыю і сельсавет.

На сходу выкрыцці Карася. Ён схіліўся над крэслам, грукаў ім і засьмяяўся.

— Ну, што-ж, на электрычнае крэсла, значыць, сядзіца, хэ-хэ-хэ...

— Гэсе ты пра партыйную праверку? — запытаў старшыня парткіі.

Карась замаўчаў, нахмурыўся і зноў засьмяяўся.

— Гэта вынішчыцу... вылецела.

Карась спрабаваў значэ раз скарыстаць часовую адсутнасьць пасьлічан у сваіх кулацкіх мэтах. Але яму не ўдалося, хоць рашэньні ўзгадаліся многае.

... Ціка і спакойна жыла паселіцкая парт'ячэйка. Не зауважвала яна, як прабралася ў калгас кулацкая шайка і, скарыстоўваючы адсталыя настроі калгасьнікаў — учарашніх адпаасобнікаў, вяла падрыўную работу. Не заўважала ячэйка, як член сельсавету Мароз, разам з кулакамі арганізоўваў контр-рэвалюцыйны сабатаж загатовак, як член камісіі садзейнасьці Пінавзраў, зьмяншаючы плян загатовак, праводзіў палітыку выкананьня кулака ад выкананьня заданьняў па цьвёрдаўных загатоўках. Ячэйка, пад кіраўніцтвам перараджэнцаў Карася і Ціхага, не заўважала, як апошнія праводзілі ва практыцы гэту кулацкую палітыку.

І нешы цяпер, пасьля судовага працэсу над Марозам, толькі ў гэты вечар пасядзэньня парткіі пасяліцкія члены ячэйкі зразумелі Карася, Ціхага і інш.

І ня толькі члены ячэйкі. Калгасны актыў, адпаасобнікі кантрактанты, якія прысутнічалі ў хаце, зразумелі ў гэты вечар мно гае. А імешка: «барацьба за хлеб — барацьба за сацыялізм».

— Што значыць зараз ня выканаць плян загатовак? — гаварыў тав. Лаўкоў, заг. культпропам ЦК КП(б)Б, які быў у гэты вечар на пасяджэньні парткіі, — гэта значыць ня даць хлеба рабочым, ня даць хлеба Чырвонай армії, гэта значыць, аслабіць сацыялістычнае будаўніцтва, абаропаздольнасьць нашай краіны.

Чаму ня выканан у тэрмін плян загатовак у Паселіцкім сельсавеце? Таму, што ня было барацьбы з кулацкім сабатажам. Таму, што ў сельсавет забраўся кулак, а ў парт'ячэйку прабраліся перараджэнцы — кулацкія агенты.

Можна было пазіраць у гэты вечар на тварах асобных дзядзькоў спачатку зьдзіўленыя, потым нянавісьць да ворага.

Мароз, выбраны імі ў члены сельсавету, аказаўся контр-рэвалюцыянэрам. «Добрыя і старанныя работнікі» ў калгасе аказаліся кулакамі, якія падрываюць калгас з сяродзіны. Член камісіі садзейнасьці Пінавзраў — осьлыны антысавецкі элемэнт, які прабраўся ў камісію садзейнасьці, каб адтуль шкодзіць савецкай уладзе. Сакратар парт'ячэйкі Карась, «камуніст» Ціхі, Пінчук, — самыя зьлейшыя ворагі народу. Клясавы вораг прабраўся ў калгас, паслаў сваіх агентаў у сельсавет, фармаваў агентуру ў радах партыі — гэта было позна. І гэта новая форма супраціўленьня клясавага ворага спачатку з трудносьцю ўкладалася ў мозг малодзькай частцы паселіцкіх членаў ячэйкі, калгасьнікаў, актывістаў. Як-жа так? Чаму раней яны гэтага не заўважвалі? Калі-ж Карась кінуў слова аб «электрычным крэсьле» — вочы расчыніліся многім. Маса шумела. Праслі слова.

— Ты сваю кулацкую брахню кінь. Ніхто не паверыць. Раскажы лепш, як ты нам тлумачыў рэвалюцыйную законнасьць савецкай улады.

Некаторыя бачком, ня гледзячы ні на кога, выходзілі з хаты. Іх праводзілі кпінамі і лаяцкай. Гэта былі «цьвёрдазаданьні» і іншыя злосныя нядзітныя збожжа.

У хаце-ж са слоў саміх дзядзькоў малюнак кулацкіх махінацый разгортваўся ва ўсіх сваіх дэталях.

Карась прымаў удзел у давядзеньні пляну загатовак і пінаўжага пуда не даўёў да кулацка-заможных гаспадарак. Для гэтага ён, як сакратар парт'ячэйкі, зацьвердзіў зьменшаны плян загатовак на сельсавету на 27 проц. «Лепш кулаку, чым дзяржаве» — такая формула акцыцыфрыляцыі адкрыта ляжала сельсавету Марозам. Апошні накла даў на бяднацкія гаспадаркі па 19 пудоў і 2 пуды на кулака Кіраўнічку. Карась жа нават «узаконіў» стаўку на недатыкальнасьць кулака. Робчы даклад аб рэвалюцыйнай законнасьці, ён даводзіў масам:

— Пяча такой устаноўкі зараз, каб наступаць на кулака. Чулі пра другую пяцігодку? Мы пачынаем будаваць бясклясавае грамадзтва. А раз ня будзе клясаў, ня будзе і кулака. Навошта-ж паўсюкаць?

Закончаны кулацкі перараджэнец стаяў на сцэне і ўсьміхаўся. Паўставалі пытаньні. Як мог ён так доўга трымацца ў партыі, нават кіраваць ячэйкай? Куды-ж глядзелі паселіцкія камуністы, райком, які калісьці санкцыянаваў яго сакратарства? Дзе была іх палітычная пільнасьць?

І сапраўды. У барацьбе за збожжа праявяцца кожны камуніст, кожнае партыйнае кіраўніцтва. Актывізуюцца адны, праяўляюць сваю ашустойлівасьць другія. Выкрываюць свой сапраўдны кулацкі твар трэція. Сапраўды бальшавіцкая праверка.

Той вечар ня толькі выкрыў твар яшчэ двух закончаных перараджэнцаў: Ціхага, які, будучы старшынёй калгасу, дапусьціў тупы кулацкую шайку; Пінчука, які праводзіў кулацкую палітыку ў сваёй маленькай краме (за кароткі час ён нарабіў шмат спраў: сьпіцыў продаж солі, прахапаў гарэлку з нагрузкай пазыкі «4 заключнага», забясьпечваў гасай толькі адпаасобны сэктар, пакінуўшы без сьвятла калгасы і іншыя грамадзкія арганізацыі).

Той вечар даў зразумець свае вокны і Зайцу, і Радзюкоўскаму. Першы ўцяшыў, да чаго можа прывесьці адсутнасьць праверкі давядзеньня пляну да кожнай гаспадаркі, чаго ён, як былы старшыня сельсавету, не забясьпечыў. Другі, тав. Радзюкоўскі, шчыра, па-рабочаму вынёс перад масай і сабой палітычнае значэньне таго, што значыць быць пасыўным зараз на фронце збожжазагатовак. І той і другі, а за іх і інш. таварышы добра ўсьвядомілі ў гэты вечар, што «барацьба за збожжа — барацьба за сацыялізм».

Парткіі выключала з партыі кулацкіх агентаў — Ціхага, Карася, Пінчука. Вынесла вымову Радзюкоўскаму і Зайцу з тым, каб праверыць іх яшчэ раз у барацьбе за поўнае выкананьне ўсіх відаў загатовак па Паселіцкаму сельсавету.

Актывізавалася і частка прысутных у аўдыторыі. Нам расказвалі, што ў гэту ноч група адпаасобнікаў кантрактантаў, зьвяла аднаго кулака, які закопваў збожжа.

— Ты што, чортаў лапаць, хлеб ад дзяржавы хаваць? Гніць? Пад суд цябе мала...

— Ты-ж сам ня здаў?...

— Як гэта ня здаў? Заўтра-ж дакапаю.

Праз замгоцаныя вокны хаты доўга расьпіваліся пучкі сьвятла на пачэсныя дарогі вёскі Паселічы. Пасьля пасяджэньня парткіі там выбралі новага сакратара, а по тым разам з актывам брыгад абмяркоўвалі работу сьвятрашняга дня, які абяцаў шмат работы.

З разьмеркаваньнем пляну была блытаніна. Ня выяўлены яшчэ былі добра цьвёрдазаданьнікі. Кулацкая спадчына адчувалася ў кожнай справе, куды ня кінься. Але паветра было чыстае, і нешк лёгка было зараз, нават пасьля цяжкага дня і бяссонай ночы, бранца за новую справу, за новую барацьбу. Нехта ўспомніў.

— Ужо новы год, таварышы.

— З новым годам, з новым шчасьцем — пяцігодачкай. — хіхікнуў раптам Карась і асеўся, нерашуча пакруціўшы ў цемнаце сваім закончаным пімятым ліхтарыкам.

— Якое тваё шчасьце... Эх, кулацкая!..

Здалёк мы ні чулі, якім яшчэ эпітэтам узнагародзіў дзядзька былога сакратара ячэйкі.

Ліхтарык Карася шчэ мігціеваў па цёмных вуліцах вёскі, пібы шукаючы ашоры ў гэтыя бяздонныя ночы.

Наша зьмяна пераскала вёску і нанесла па вячной яміснай мёрзлай дарозе.

Сход у Паселіцкім сельсавеце пакрэсьліў яшчэ раз адзіна правільнае разуменьне сутнасьці нашай барацьбы: ліквідацыя капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул ня мінуча зьвязана і ў далейшым з абвастраньнем клясавай барацьбы ў асобныя моманты і асабліва ў асобных раёнах і на паасобных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва».

Не, ня гладкая мірная дарога вядзе ў сацыялізм, як хацеў даказаць пасяльчанам кулацкі перараджэнец Карась.

«Змяшчэньне клясаў шляхам бязьлітаснай клясавай барацьбы пралетарыяту — такая формула Леніна» (Сталін).

Гэта зразумелі пасяльчане ў тую ноч перад новым годам.

Алеся Сучкова.

Паселічы, Хойніцкі раён.

Аб выніках партдня 29 сьнежня

Пастанова бюро Менскага гарадзкога камітэту КП(б)Б

Заслухоўваючы вынікі праведзанага спецыяльнага партдня па пытаньні рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) аб ходзе сельска-гаспадарчых загатовак па Беларусі ў ячэйках менскай гарадзкой партыйнай арганізацыі, бюро Менскага гаркому КП(б)Б адзначае, што ўсе ячэйкі поўнасьцю ўхвалілі пастанову ЦК УсеКП(б), пастанову бюро ЦК КП(б)Б і гарадзкога актыву, правільна ацанілі ўсё палітычнае значэньне гэтых пастаноў, як пастаноў, усярываючых гніла-ліберальныя адносіны партыйных і савецкіх арганізацый да сельска-гаспадарчых загатовак па Беларусі, а таксама недаразуменьне палітычнай і практычнай работы па пытаньнях вельскай гаспадаркі ў Беларусі, у прыватнасьці не сацыялістычнай рэканструкцыі. У рэзультаце гэтага аслабілася барацьба супроць рэштак кулацтва і іх новых кансэраў, супроць агентуры клясавага ворага, сьмялёна выступаючай пад фальшыва-нацыянальным сьцягам разам з усімі асколкамі правага-клясавацкіх, апартуністычных, трацкісцкіх, перараджэнскіх і буржуазна-нацыяналістычных элемэнтаў, атрымаўшых свае канцэнтраванае выяўленьне ў арганізацыі кулацкага сабатажу на фронце сельска-гаспадарчых загатовак.

Разам з тым бюро ГК лічыць, што на гледзячы на праўільную палітычную ацэнку менскай партыйнай гарадзкой арганізацыяй у абмеркаваньні гэтага пытаньня па ячэйках, пастанова ЦК УсеКП(б) ня была поўнасьцю выкарыстана для выяўленьня ўсіх недахопаў і пакупак мясцовага ячэйковага парадку і ўвязі іх з агульна-палітычнымі задачамі, якія стаяць перад партыяй. Выяўленьня-ж канкрэтныя недахопы і спажэньні лініі партыі ў сваёй большасьці невыстарчальна былі скарыстаны для далейшага выяўленьня да канца, выкрыцьця і рашучай барацьбы супроць буржуазна-нацыяналістычных элемэнтаў, рэштак нацдэмаўшчыны, апартуністаў, перараджэнцаў, гніліі. Гэта паказвае яўб ашчэ слабо разгорнутую самакрытыку і невыстарчальна канкрэтнае яе ўжываньне. Частка ячэек абмежавалася прыняцьцем стандартна-дэкларацыйных пастаноў, не падмацоўваючы іх ударам па канкрэтных посьбітах спажэньняў лініі партыі.

Абмеркаваньне пастановы ЦК УсеКП(б) выявіла ў радзе калектываў наяўнасьць апартуністычных, перараджэнскіх элемэнтаў у радах партыі, адкрыта абараняючых клясава-варожыя пазыцыі: БКС—Бізнута, завод імя Мясьнікова — Чыж, Белдзяржбуд — Рубенчык, Дзяржплан — Воўкэ і інш. Адначасова ў працэсе прапрацоўкі гэтай пастановы ў ячэйках Белдзяржснабу, Эльводу, дэпо заводу імя Мясьнікова і інш. выяўлены факты сямейнасьці, групаўшчыны, круговой парукі і заціску самакрытыкі.

Бюро ГК КП(б)Б падкрэсьлівае, што ў рэзультаце недастатковай увагі з боку партканцтыкаў і ячэек у працэсе абмеркаваньня пастановы ЦК УсеКП(б) і пастановы менскага гаркому найбольш слабо прапрацавана значэньне нацыянальнага пытаньня ў сьвятле задач, пастаўленых пастановай ЦК УсеКП(б).

Справа Белдзяржснабу, Дзяржземтрэсту і інш. з усёй яркасьцю паказвае адкрытую актывізацыю клясава-варожых, буржуазна-нацыяналістычных элемэнтаў, якія ў цяперашні перыяд абвостранай клясавай барацьбы і ліквідацыі кулацтва прыкрываюцца фальшыва-нацыянальным сьцягам у простай абарэне пазыцыі кулака, ня грабуючы нікімі сродкамі барацьбы (шкодніцтва, крымінальшчына) — і з боку раду камуністаў, непасрэдна працуючых у даных апаратах, не знаходзілі, з прычыны гніла-ліберальных адносін, неабходнага рашучага адпору.

Бюро ГК КП(б)Б абавязвае ўсе парткалектывы і ячэйкі паглыблена прапрацаваць у шырокіх партыйных масах пастанову ЦК УсеКП(б) пад кутом погляду яшчэ большай мабілізацыі партыйных мас на барацьбу з правымі і «левымі» апартуністамі, контр-рэвалюцыйнымі трацкістамі, перараджэнцамі, буржуазна-нацыяналістычнымі элемэнтамі — на выяўленьне канкрэтных асоб і фактаў спажэньня лініі партыі, забясьпечыўшы пастаноўку гэтых пытаньняў на прынцыповапалітычную вышыню і арганічна ўвязваючы іх з агульна-палітычнымі гаспадарчымі задачамі і жыцьцём усёй КП(б)Б, лічачы, што толькі ачысьціўшы рады партыі ад гніліі і перараджэнскіх элемэнтаў і зламаўшы контррэвалюцыйнае супраціўленьне, арганізаванае кулаком на сяле, а таксама праяўленьні шкоднітва і сабатажу ў савецкім апараце, менская гарадзкая партыйная арганізацыя даб'ецца сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў у рабоце па забесьпячэньні выкананьня ўсіх дырэктыў партыі.

Бюро ГК КП(б)Б патрабуе ад усіх партарганізацый неаслабнай работы па выкрыцьці і выяўленьні элемэнтаў сямейнасьці, групаўшчыны, кругавой парукі, што стварае спрыяючую глебу для разлажэньня, замазваньня канкрэтных недахопаў і заціску самакрытыкі. Асноўнай задачай усёй партарганізацыі бюро ГК ставіць рашучае ўмацаваньне бальшавіцкай дысцыпліны і зжыцьцё элемэнтаў расхлябанасьці, бездапаможнасьці і гніла-ліберальных адносін да парушальнікаў іх.

Бюро ГК КП(б)Б даручае гарКК і адпаведным бюро парткалектываў і ячэек у трохдзённы тэрмін разгледзець пытаньне аб выяўленых у працэсе абмеркаваньня пастановы ЦК УсеКП(б) фактах сямейнасьці, групаўшчыны, кругавой парукі, заціску самакрытыкі (Белдзяржснаб, Эльвод, завод імя Мясьнікова, дэпо і г. д.), а таксама аб фактах антыпартыйных і трацкісцкіх выступленьняў у ячэйках Дзяржпляну і БКС.

Задачай усёй партарганізацыі зьяўляецца рашучая очыстка радоў партыі ў савецкага апарату ад усіх клясава-варожых, буржуазна-нацыяналістычных, нацдэмаўскіх элемэнтаў і ўсіх тых, якія свою антысавецкую работу прыкрываюць фальшыва-нацыянальным сьцягам, а таксама супроць усіх элемэнтаў перараджэньня, гніліі і апартуністаў. Бюро гаркому КП(б)Б асабліва падкрэсьлівае неабходнасьць правільнага, немэханічнага правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі, узмацняючы барацьбу супроць вялікадзяржаўнага шавінізму — галоўнай небясьпекі на даным этапе, а таксама шавінізмаў усіх масьцей і адценьняў.

Канстатуючы, што прапрацоўка пастановы ЦК УсеКП(б) у савецкіх і вузаўскіх ячэйках прайшла зусім нездавальняюча і ня выкрыла да канца элемэнтаў гніліі, разлажэньня і перараджэньства, — прапанаваць арганізацыі арганізаваць спэцыяльны партдзень у савецкіх і вузаўскіх ячэйках па паглыбленым абмеркаваньні пастаноў ЦК УсеКП(б), забясьпечыўшы выпучэньне ў ячэйкі моцных, кваліфікаваных дакладчыкаў.

Даручыць гаркому ЛКСМБ у аднадзенны тэрмін распрацаваць рад канкрэтных мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць шырокае абмеркаваньне пастаноў ЦК УсеКП(б), бюро ЦК КП(б)Б і гарадзкога актыву усёй камсамольскай арганізацыяй.

Даручыць гарКК РСІ на сваёй лініі радам канкрэтных мерапрыемстваў узмацніць работу, не чакаючы агульнай чыстки, па рашучай сыстэматычнай праверцы і ачыстцы радоў менскай партыйнай арганізацыі, а таксама савецкага і гаспадарчага апарату, мабілізуючы партыйную арганізацыю і кожнага камуніста на канкрэтную барацьбу за правядзеньне генэральнай лініі партыі.

Прапанаваць фракцыі ГСПС арганізаваць шырокую прапрацоўку пытаньняў аб папярэдніх выніках работы па выкананьні сельска-гаспадарчых загатовак сярод шырокіх беспартыйных мас і дабіцца канчатка пералому ў справе ўзмацненьня пралетарскага ўплыву і канкрэтнай дапамогі вёсцы, асабліва шырокага разгортваньня шэфскай работы, а таксама аказаць дапамогу ў выкананьні вёскай поўнасьцю і ў тэрмін усіх сельска-гаспадарчых загатовак.

Бюро ГК КП(б)Б лічыць неабходным абмеркаваць даную пастанову бюро на партдні 10-га студзеня, забясьпечыўшы канкрэтныя мерапрыемствы, якія выцякаюць з пастаўленых гэтай пастановай задач.

ДАДАТКІ І ЗЬМЕНЫ ЁСЬЦЬ...

У таго самага Канавалава Яўмена Маркавіча, што ў гады грамадзянскай вайны лічым матросам Дняпроўскай ваеннай флётыліі самааддана змагаўся з дзянікінцамі, у таго Канавалава, які ў самыя адказныя і цяжкія часы барацьбы за Саветы ні на хвіліну не пакідаў свайго паста, які заўсёды змагаўся супроць бандытызму, які ад гомельскіх пралетараў атрымаў пачэсную грамату героя працы, а зараз атрымлівае дзяржаўную пэнсію, школі ня меў і ня мае ніжай маемасьці, акрамя старой драўлянай хаты, і які зараз некалькі месяцаў у год вартуе на гомельскай прыгані прафсаюзныя лодкі,—у гэтага самага Канавалава валасы сталі дыбам і падкасіліся ногі, калі ён прачытаў паведамленьне:

— Гомельскім гарфінадзелам на 1932 г. ён абкладзен падаткам у разьмеры 1.000 руб...

Так, так—тысячу рублёў і ні адной капейкі менш!

І яшчэ адна акалічнасьць зьдзівіла старога: яго сыну—студэнту Ленінградзкага інстытуту інжынэраў водзнага транспарту Аляксею, які быў камандыраван у Гомель на вытворчую практыку, «не знайшлося ў Гомелі месца», як сыну... чужога элемэнта—гомельскае воднае начальства сарвала яму вытворчую практыку...

Калі ласка, ня здзіўляйцеся. Адну хвілінчку цярплівасьці і ўсё будзе зразумела:

27 тэрвеня на старонках «Палескай праўды» была зьмешчана невялічкая заметка. Кароткі зьмест яе такі: кіраўнікі гомельскіх водных арганізацый, сярод якіх выдзяляецца член праўленьня АОВОД'у Буздык, мешаюць за ўсё цікавяцца свайміі непасрэднымі абавязкамі, а больш за ўсё захоплены міжведамасьцьвенай барацьбой. Пад заметкай значыліся ініцыялы—А. К. І ўсё.

— А прычым тут Канавалаў, гарфінадзел і падатак?

Няўжо яшчэ не зразумела? У такім выпадку падамо яшчэ адну дэталь:

Калі сын Канавалава—Аляксей прышоў у рэдакцыю «Палескай праўды» з мэтай абскарджаньня няправільных і беспадстаўных дзеяньняў фінадзелу, яго выслухаў работнік рэдакцыі Маластоўкер і, між іншым, адзначыў:

— Па-першае, мы табе ня маем ніякай падставы верыць, бо ты напісаў кампрамэтуючы матар'ял на пашага старога рабкора Буздыка і, між іншым, зрабіў гэта толькі тады, калі апошні напісаў у газэту аб тым, што твой бацька кулак і чужы элемэнт...

Усё-такі яшчэ ня ясна? Ну, тады пастараемся самі разблытаць усе гэтыя палажэньні і даныя, загадзя даруючы Маластоўкеру тое, што ён крыху перабліта даты некаторых дакумантаў.

І так, запамятаем: **27 ЧЭРВЕНЯ** ў «Палескай праўдзе» была апублікавана заметка студэнта Ал. Канавалава (А. К.) аб гомельскіх асвадаўцах, а **2-га ЛІПЕНЯ** вядомы нам Буздык напісаў доўгі, доўгі ліст:

«... На Крушаўскім спуску ў Гомелі стаіць **асабняк**, у якім пражывае вядомы ўсім **Канавалаў. Гэты тып жыве як паменчык** у былы час, ён **мае свае лодкі і дубы**, займаецца **эксплёатацыяй**, абзбірае народ, за летні час мае ня менш **50 ТЫС. РУБ. ДАХОДУ** і не абкладаецца падаткам»... і разаслаў гэты свой ліст ва ўсе канцы сьвету, не абмінуўшы гомельскага гарфінадзелу. Адным словам, вока за вока, галава за зуб...

А неўзабаве—трохнае паведамленьне аб падатку, зрыў вытворчай практыкі студэнта-рабкора.

Наўрад ці ёсьць патрэба даказваць, што мы тут маем справу з грубым зацісканьнем самакрытыкі, з выразным фактам праследаваньня рабкора. Наўрад ці ёсьць патрэба напамінаць аб тым, што вінаватыя ў гэтым падлягаюць суроваму пакараньню.

Водаў і разумоў гэта Канавалаў, ведалі і разумелі гэта адказныя работнікі з гомельскай гарКК-РСІ. Толькі... ножны пасвойму разумеў.

Канавалаў аб усім гэтым падаў заяву ў бюро скаргаў памянёнай гарКК-РСІ, а бюро, пачакаўшы тры тыдні, не сьпяшаючыся вынесла пастанову:

«... адзначыць, што з боку гарфінадзелу **няправільна** ўлічана абкладаньне за карыстаньне лодкамі... **36 лодак у тав. Канавалава ня было**, а ён зьяўляецца **вартаўніком** лодак Палесдруку і іншых арганізацый, а таксама зьяўляецца пэнсыянэрам.

«Выходзіць з гэтага, прапанаваць гарфінадзелу **перагледзець** справу Канавалава **ў бок зьмяншэньня** абкладаньня.

«З боку адзелу кадраў водзнага транспарту былі праяўлены абсалютна-**няправільныя адносіны** да студэнта—сына Канавалава... за што абвясьціць загадчыку адзелу кадраў тав. Ізакову вымову...

«Справу аб абвінавачаньні тав. Буздыка ў заціску самакрытыкі і няправільным падыходзе да тав. **Канавалава зьмясьціць асобна.**

«Адначасова лічыць, што заметка ў «П. П.» ад 27-га чэрвеня б. г. «Асвадаўцы ратуюць людзей» **цалкам пацьвердзілася...**

Загадчык бюро скаргаў АРОНАВА».

Усё?—Усё! Дапаткаў няма?—Няма.

ЗАЦЬВЕРДЗІЦЬ: старшыня гарКК ДЗЕЦКІ.

Пачакайце! Адну хвілінчку, тав. Дзецкі. У нас ёсьць і дадаткі, і зьмены, і заўвагі:

Па-першае, як вы думаеце, факт з падаткам у 1.000 руб. гэта проста канцылярская апісачка, маленькая недакладнасьць, ці результат палітычнай блізарукасьці і бяспрынцыпнасьці з боку работнікаў гарфінадзелу, за што ў нас—няхай будзе гэта вам вядома—па гладзяць па галоўцы?

Па-другое, ці не здаецца вам, між іншым, што «з боку адзелу кадраў водзнага транспарту былі праяўлены» **НЕ «абсалютна няправільныя адносіны** да студэнта Канавалава», **а выразныя захады пазбавіцца ад неспакойнага рабкора?**

Па-трэцяе—мы ніяк ня можам дапусьціць, што наскрозь ілжывы данос Буздыка на Канавалава ўзьнік імэнна **пасьля** допісу А. К. у «Палескай праўдзе» **выпадкова.** Мы таксама ня можам дапусьціць і таго, што Буздык аб прозьвішчы аўтара заметкі «Асвадаўцы ратуюць людзей» даведаўся, скажам, праз сон або пры дапамозе якой-небудзь чараўніцы. Ці не адыграла тут пэўнай ролі радзецкая «Палескай праўды», якая, да рэчы, замест псэўдоніму, напісанага аўтарам **(Ведаючы)**, пад артыкулам А. Канавалава паставіла вядомыя ўжо нам ініцыялы **А. К.?**

І апошняе: ці вядома вам, таварыш Дзецкі, тое, што падатак Канавалаву зьнижан да... **570** руб.; тое, што чыноўнікі з гарфінадзелу 5-VIII **апісалі** ў Канавалава хатнюю маемасьць і праз **тры дні** вынна чылі **прадаць яе з таргоў**; тое, што Наркамфін БССР скасаваў гэта «мудрае» рашэньне разьюшаных бюракратаў з гарфінадзелу і, нарэшце, тое, што ваша пастанова **аб вылучэньні ў асобную** справу пытаньня аб заціску самакрытыкі з боку Буздыка, толькі вылучана, але да гэтага часу **не разглядзена?**

... Вялікадушна просім усе нашы заўвагі і дадаткі прыняць да ведама і сваю пастанову перагаласаваць.

Віт. Даль.

Аб папярэдніх выніках праверкі кантынгентаў рабочага забесьпячэньня па гораду Менску

Пастанова бюро Менгаркому КП(б)Б ад 5 студзеня 1933 г.

1. Адзначыць, што рад фабрычных, заводзкіх арганізацый і навучальных устаноў (завод імя Молатава, фабрыка «Камунарка», шэйная фабрыка імя Крупскай, фінансавы інстытут, плянава-эканамічны камбінат і інш.) замест бальшавіцкай барацьбы за эканомію хлеба дапусьцілі гніла-ліберальныя адносіны да праверкі кантынгентаў рабочага снабжэньня і ачысткі іх ад прыхлябальнікаў, дармаедаў і антысавецкіх элемэнтаў, а таксама правялі рвацкія тэмпэнцыі пры падачы заявак на ўстанаўленьне цэнтралізаваных фондаў снабжэньня (па лініі прадпрыемстваў заўкі аб'яднаньняў і прадпрыемстваў перавышаюць фактычную наяўнасьць рабсілы на 1.653 асобы супроць кантынгентаў Наркамснабу і на 696 асоб супроць кантынгентаў Белкаапсаюзу).

2. Асобныя трэсты, аб'яднаньні і наркаматы (Белдрэў, шэйаб'яднаньне, БЕЛКМО, Наркамлёгпрам, Наркамснаб і інш.), не правяраючы фактычнай наяўнасьці рабсілы на прадпрыемствах, штампавалі няправільныя, рвацкія заўкі сваіх прадпрыемстваў.

3. Лічыць устаноўленым, што за падачу няправільных рвацкіх заявак на кантынгенты рабочага снабжэньня, за штампаваньне гэтых заявак, атрыманьне лішніх прадуктовых картак у парафіяльны з фактычнай наяўнасьцю рабсілы, незабесьпячэньне кантролю за падачай гаспадарнікамі заявак, шкрыпяцьце мер да звароту выехаўшымі студэнтамі на канікулы хлебных кніжак — нясуць адказнасьць:

1. Па Белшэйаб'яднаньні нам. кіраўніка тав. **Бэйлін.**

2. Наркамлёгпрому — заг. сэктару рабочага снабжэньня т. **Бэрліна.**

3. Белдрэву — нам. кіраўніка тав. **Лабрынскі** і адказны выканаўца **т. Гохштэйн.**

4. Школа фабрыкі імя КІМ — дырэктар тав. **Лемберг.**

5. Фабрыка «Камунарка» — нам. дырэктара т. **Беленькая.**

6. Шэйная фабрыка імя Крупскай — дырэктар т. **Шмуклер** і старшыня фабкому т. **Іофэ.**

7. Завод імя Молатава — б. нам. дырэктара па рабочым снабжэньні тав. **Кастрынскі.**

8. Фін.-эканамічны інстытут — дырэктар тав. **Івашчанка.**

9. Плянава-эканамічны камбінат — нам. дырэктара тав. **Гурын.**

Бюро Менгаркому КП (б)Б пастанаўляе:

1. Тав. **Бэйліна,** нам. кіраўніка Белшэйаб'яднаньня, тав. **Дабрынскага,** нам. кіраўніка Белдрэву, тав. **Гохштэйна,** адказнага выканаўцу Белдрэву — аддаць пад суд за падачу ў органы снабжэньня няправільных рвацкіх заявак сваіх прадпрыемстваў на кантынгенты рабочага снабжэньня.

2. Тав. **Івашчанку,** дырэктара фін.-эканамічнага інстытуту **АДДАЦЬ ПАД СУД** за падачу рвацкай заўкі на кантынгенты снабжэньня, якая не адпавядае фактычнай наяўнасьці студэнтаў, за незабесьпячэньне ці чы выехаўшымі на канікулы студэнтамі хлебных кніжак.

3. Тав. **Бэрлінай,** заг. сэктару рабочага снабжэньня Наркамлёгпрому, за адсутнасьць крытычнага падыходу і кантролю за заўкамі аб'яднаньняў і прадпрыемстваў на кантынгенты рабочага снабжэньня — **АБВЯСЬЦІЦЬ ВЫМОВУ.**

4. Тав. **Беленькай,** нам. дырэктара фабрыкі «Камунарка», тав. Шмуклер, дырэктару шэйнай фабрыкі імя Крупскай, старшыні фабкому фабрыкі імя Крупскай, за падачу няправільных заявак, перавышаючых фактычную наяўнасьць рабсілы на прадпрыемствах, — абвясьціць **СУРОВУЮ ВЫМОВУ З ПАПЯРЭДЖАНЬНЕМ** аб тым, што пры паўтарэньні падобных зьявішч у далейшым яны будуць выключаны з партыі і аддадзены пад суд.

5. Тав. **Лембэргу,** дырэктару школы фабрыкі імя КІМ, за атрыманьне ад стала выборных дакумантаў гарсавету лішніх прадуктовых картак у парафіяльны з фактычнай наяўнасьцю рабсілы, за незабесьпячэньне здачы выехаўшымі на канікулы вучнямі хлебных кніжак, — абвясьціць **СУРОВУЮ ВЫМОВУ З ПАПЯРЭДЖАНЬНЕМ** аб тым, што пры паўтарэньні падобных зьявішч у далейшым ён будзе выключан з партыі і аддан пад суд.

6. Тав. **Гурыну,** нам. кіраўніка плянава-эканамічнага камбінату, за непадачу паўторнай заўкі на фактычную колькасьць студэнтаў, незабесьпячэньне здачы выехаўшымі на канікулы студэнтамі хлебных кніжак — абвясьціць **СУРОВУЮ ВЫМОВУ З ПАПЯРЭДЖАНЬНЕМ.**

7. Прасіць гарКК КП(б)Б разгледзець і вырашыць пытаньне аб прыцягненьні да партыйнай адказнасьці тав. **Кастрынскага,** б. нам. дырэктара па рабочым снабжэньні заводу імя Молатава, адказнаючага за падачу няправільнай рвацкай заўкі на кантынгенты рабочага снабжэньня па заводу.

8. Папярэдзіць усіх кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў, сакратароў партыйных ячэек і старшынь ФЗМК, што яны нясуць поўную адказнасьць за правільную падачу заявак на кантынгенты рабочага снабжэньня і што за малейшае перавышэньне заявак у парафіяльні з фактычнай колькасьцю людзей яны будуць прыцягнуты да суровай партыйнай і судовай адказнасьці.

9. Даручыць камісіі бюро ГК КП(б)Б пад адказнасьць тав. **Кандана:**

а) Праверку кантынгентаў па астатніх прадпрыемствах гораду, установах, ВНУ і ВТНУ праводзіць далей.

б) Да 10-І—1933 г. праверыць расходваньне хлеба на 25 сталоўках гораду.

в) Правесьці праверку ўтрымацтва, маючых права на снабжэньне па цэнтралізаваных фондах.

г) Да 8-І—1933 г. правесьці выбарачную праверку расходваньня хлеба па крамах.

д) Да 12-І—1933 г. правесьці выбарачную праверку расходваньня хлеба па закрытых установах (больніцы, школы, яслі і г. д.).

е) 7-І—1933 г. на хлебазаводзе правесьці шырокую вытворчую нараду па пытаньні барацьбы з раскрадваньнем хлеба, павялічэньня прыпёку і барацьбы за эканомію хлеба.

ж) Устанавіць парадак справаздачнасьці арганізацый перад камісіяй аб расходваньні хлеба і мукі па цэнтралізаваных фондах.

з) 9-І—1933 г. склікаць нараду трыкутнікаў гораду па пытаньні папярэдніх вынікаў праверкі кантынгентаў і задачах заводзкіх арганізацый у барацьбе за эканомію хлеба.

Сакратар Менгаркому КП(б)Б ШПЭКТАРАЎ.

М. А. Рабцэвіч

Перараджэнцы з Бягомля

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

У «Дзіцячай хваробе лявізны ў камуністычным» ваш. Ленін казаў: «Дыктатура пролетарыяту ёсьць самая лютая, самая вострая, самая бязьлітасная вайна новай клясы супроць больш магутнага ворага, супроць буржуазіі, супраціўленьне якой удесяцярэна не зьмяншаецца (хоць-бы ў адной краіне) і магутнасьць якой заключаецца ня толькі ў сіле міжнароднага капіталу, у сіле і моцнасьці міжнародзкай сувязі буржуазіі, але і ў сіле ярлыкчыі, у сіле дробнай вытворчасьці. Бо дробная вытворчасьці засталося яшчэ на сьвеце, на вялікі жаль, вельмі і вельмі шмат, а дробная вытворчасьць парадзіла капіталізм, і буржуазію пастаянна, штодзённа, штогадзінна, стыхійна і ў масавым маштабе» (Ленін, т. XXV, стар. 173).

Тэзу «вялікага над буржуазіяй немагчыма без прэзыжкай, упартай, зацятай вайны не на жыцьцё, а на сьмерць, — вайны, якая патрабуе вытрымаласьці, дысцыпліны, цьвёрдасьці».

Неабходнасьць вытрымаласьці, цьвёрдасьці і жалезнай волі, як ніколі, патрабуецца зараз. Перамагчы мільёны і мільёны дробных гаспадарыкаў у тысячу раз ніжай, чым перамагчы буйную буржуазію. Між тым «мільёны і мільёны дробных гаспадарыкаў... сваёй штодзённай, будзённай, нябачнай, пяўлёўнай, разлагаючай дзейнасьцю ажыцьцяўляюць такія самыя результаты, якія патрэбны буржуазіі, якія рэстаўруюць буржуазію. Хто хоць колькі-небудзь пасьлядоўна жалезную дысцыпліну партыі пралетарыяту (асабліва ў часе яго дыктатуры), той фактычна дапамагае буржуазіі супроць пралетарыяту» (Ленін, т. XXV, стар. 191).

Усё гэта патрабуе ад кожнага члена радавога члена і кандыдата партыі, ня кажучы ўжо аб кіруючых партыйных работніках, бязумоўна, самай адданай, самай рашучай і бязьлітаснай барацьбы з усімі тымі буржуазна-перараджэнцкімі элемэнтамі, якія дапамагаюць кулаку ў барацьбе супроць дыктатуры пролетарыяту, супроць савецкай улады.

Малейшае аслабленьне гэтай барацьбы ёсьць самы горшы від апартунізму, які прыводзіць да двурушніцтва, палітычнага і маральнага разлажэньня і поўнага буржуазнага перараджэньня.

Гэтых асноўных ленінскіх установак не зразумелі і ня ўлічылі ў сваёй рабоце кіраўнікі Бягомльскага раёну ў асобах сакратара РК КП(б)Б **Індуліна,** заг. арганадзелу **Бабянкова,** старшыні РКК КП(б)Б **Акулёнка,** намесьніка **Клаўко** і старшыні РПС **Глухоўскага.** Яны, адарваўшыся ня толькі ад беспартыйных працоўных мас, але нават і ад партарганізацыі, зпраздзілі інтарэсам партыі і сталі на шлях адкрытай абароны кулакоў.

Гэтыя кулацкіх агенты з партбілетамі ў кішэнях замест арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, замест выкананьня палітычна-гаспадарчых мерапрыемстваў, ума цаваньня дыктатуры пралетарыяту на вёсцы, далі поўную волю кулакам разбураць калгасы ў раёне, кампрамэтаваць саветы і нават разлагаць асобныя зьвенні партыйнай арганізацыі.

Для ілюстрацыі і пацьвярджэньня паказанага падамо некалькі фактаў.

Кулацкімі элемэнтамі разбураецца калгас **«Чырвоны франтавік», Недальскага** сельсавету. Партыйная ячэйка выяўляе там тры кулацка-заможныя гаспадаркі і выключае іх з калгасу. Спрот іх і кулачку Тубалцэ-Дуброўскую, муж якой, былы афіцэр, за актыўную контр-рэвалюцыйную работу выслан. Раённы камітэт партыі і РКК, замест таго, каб праверыць, ці няма падобных элемэнтаў у іншых калгасах, пасылае ў гэты калгас камісію за камісіяй для праверкі правільнасьці выключэньня кулакоў з калгасу і, нарэшце, адкрыта становіцца на абарону гэтых кулакоў.

Упаўнаважаны райкому КП(б)Б, сакратар РК ЛКСМБ **Бугроў** адпаўляюць гэтыя гаспадаркі ў калгасе праз галаву парт'ячэйкі, ня гледзячы на катэгарычныя пратэсты асобных членаў ячэйкі і нават раённых работнікаў.

Больш таго, гэта пытаньне ставіцца на бюро РК КП(б)Б і выносіцца пастанова, у якой канстатуецца грубае скажэньне лініі партыі, дапушчанае недальскай парт'ячэйкай — серадзінкоў, моў, палічылі за кулакоў і выключылі з калгасу, а таму сакратару парт'ячэйкі **тав. Марозу** за дапушчэньне «лявацкіх» загібаў, кампрыняцьце мер да іх выпраўленьня, за дачу на сходзе ячэйкі палітычна-няправільнай ацэнкі факту адкуленьня серадзінкоў (чыстай кулакоў—**М. Р.**) у калгасе, абвясьціць вымову». Ствараецца таксама партыйная справа і на тав. **Лапотка,** рэдактара райгазэты, які дамагаўся выключэньня гэтых кулакоў з калгасу.

Пастанова гэта сумесна з перадавым артыкулам друкуецца ў раённай газэце, выпуск якой дапасоўваецца да пленуму РК КП(б)Б з такім разьлікам, каб яе раздаць удзельнікам пленуму.

Ня гледзячы на «аўтарытэтную» даведку старшыні РКК **Акулёнка** аб тым, што «даныя гаспадаркі ня кулацкія, а бядняцкія», а таксама залвы **Бабянкова і Акулёнка** аб тым, што «ніхто ня мае права крытыкаваць кіраўніцтва райкому», — 32 удзельнікі пленуму, закананўшы гэта пытаньне, даказвалі, што памянёныя гаспадркі, як кулацкія, адноўлены райкомам у калгасе няправільна.

Старшыня РКК **Акулёнак,** бачачы такі настрой пленуму, вымушан быў «аўтарытэтна» заявіць:

— Што-ж часамі і **Ленін** заставаўся адзін і яго ўсе крыкі, але ён меў рацыю.

А сакратар РК ЛКСМБ **Бугроў** у апартуністычным запале нават умудрыўся назваць увесь пленум «бесталовымі баранкамі».

Галоўка кіраўніцтва райкому і РКК аказалася ізаляванай і адарванай ад партыйных мас.

У выніку, па распараджэньні загадчыка арганадзелу РК **Бабянкова,** 800 экзэмпляраў газэты, у якой была надрукавана пастанова райкому аб так званай ілыскай справе, канфіскуецца і знішчаецца. Выпадкаў канфіскацыі газэт у СССР ня было. Бягомльскі выпадак зьяўляецца першым.

Сакратаром ліпскай парт'ячэйкі, **Бярэзінскага** сельсавету, увесь час быў заможнік **Юркевіч Рыгор,** у якога былі батракамі нават тыя таварышы, парытэтным кіраўніком якіх ён зьяўляўся. Калгасам у гэтай вёсцы кіраваў моцны заможнік **Хаміч Марка,** у якога таксама раней былі батракі.

Над іх кіраўніцтвам у ячэйцы квітнелі папойкі, раскрадалася калгасная маемасьць, душылася і з коранем вырывалася крытыка і самакрытыка.

Камсамольская ячэйка ў асобе некалькіх ударнікаў «лёгкай кавалерыі» павяла рашучую барацьбу з недахопамі работы ў калгасе і парт'ячэйцы. Гэта работа камсамольцаў не спадабалася кіраўніком ячэйкі і сельсавету. Пры дапамозе старшыні РКК **Акулёнка** актыўных камсамольцаў прыцягваюць да да суда, бышом за хуліганства, праяўленае ў тым, што яны выкрылі папойку, у якой прымаў удзел сакратар ячэйкі і некаторыя іншыя партыйцы.

Справу гэту расьсьледваў сам старшыня РКК **Акулёнак** сумесна з нам. начальніка міліцыі **Міхалькевічам.** Спачатку імі было ўстаноўлена, што ніякага хуліганства ня было, а было сапраўднае жаданьне камсамольцаў выкрыць усе тыя агідзі, якія адбываліся ў ячэйцы і калгасе. Праз некалькі дзён, адтак, Акулёнак зьмяняе сваю думку. Ён выклікае да сябе ў кабінет Міхалькевіча і кажучы: «Ты палітычна непісьменны, гэта справа контр-рэвалюцыйная», прапануе «зрабіць дазнаньне ў трохдзённы тэрмін і вінаватых аддаць пад суд».

Тут-жа Акулёнак перадаў Міхалькевічу напісаныя ўласнаручна факты «контр-рэвалюцыйнай» дзейнасьці камсамольцаў і сыпіс асоб, якіх па гэтай справе належала дапытаць. У выніку два камсамольцы — лепшыя ўдарнікі былі асуджаны на два гады пазбаўленьня волі кожны.

Ліпская парт'ячэйка да самага апошняга часу, праўда, з другім сакратаром, прапанае папойку, разбазарвае маемасьць калгасу, душыць самакрытыку. Што гэта сапраўды так, паказвае наступны факт. Кладаўшчыкі калгасу **«Ўсход» Хаміч Пятро і Аўтушка Сыліпан** укралі тры пуды калгас нага сала, 32 пары гумкоў; **Хаміч Зьмітрок і Юхнавец Сыліпан** прадалі быка за 800 р., а грошай зналі толькі 600 р.; **Пазар Язэп** украў калгасныя пчолы і пры атрыманьні пасеінязыкі—9 пудоў збожжа, а **Лазар Іван** пры малацьбе—мяшок жыта. Старшыня калгасу **Сільвэстраў** атрымаў з банку 138 руб. прошай, але іх не запрыходаваў.

Усе гэтыя агідзі і раскрадваньні калгасай маемасьці вынуўлены старшынёй рэвізійнай камісіі, праўда, былым моцным берагіняком **Арцамёнкам,** які за актыўную работу як старшыня рэўкамісіі, нават прэміраваны. Парт'ячэйка сумесна з сельсаветам выключаюць **Арцамёнка** з калгасу, давяраючы да яго цьвёрдае заданьне, як да заможніка, і спагаваюць гэта заданьне ў бясспрэчным парадку.

У той-жа час да кулака, шкадуе сакратара парт'ячэйкі, які да 1930 г. быў улесьлікам млыну, і абкладаўся сельска-гаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку, **цьвёрдае заданьне не даводзіцца,** і гэты кулак, наперакор закону, **нават аднаўляецца ў выбарчых правах.** Гэты факт — просты адказ на ўрок, які быў дан ячэйцы старшынёй РКК Акулёнкам у справе прыходу камсамольцаў.

Вітуніцкі сельсавет — самы адсталы ва ўсіх палітычна-гаспадарчых мерапрыемствах. Ён сыстэматычна ня выконвае палітычна-гаспадарчых мерапрыемстваў. Прычыны: на чале гэтага сельсавету стаіць **Хатчэнка,** выхадзец з заможнай сям'і, злодзей, рэцыдывіст, які некалькі разоў судзіўся, нават сядзеў у папраўчым доме і, на вялікі сорам райкому, — член партыі. Намесьнік старшыні сельсавету **Бобрык** — кулак, меў больш 20 га зямлі. Сакратар сельсавету **Мурашка** — заядлы баптыст, які скончыў духоўную семінарыю.

Гэта агідная кулацкае гняздо сьвядома шкодзіла сацыялістычнаму будаўніцтву, скажаючы лінію партыі, парушаючы рэвалюцыйную законнасьць. Гэта кулацкае «трыё» у мэтах зрыву збожжазагатовак да кулацка-заможных гаспадарак давяло пляны значна меншыя, чым да серадзяцкіх.

Падобных прыкладаў засьмечанасьці савецкага апарату і парт'ячэек кулацкімі элемэнтамі можна было-б прывесьці значна больш. Зусім нядаўні і такія факты, калі члены сельсавету і нават члены партыі як напрыклад, Дуброўскі, з вёсні Ніжкі, Недальскага сельсавету, выдаюць даведкі кулакам аб тым, што яны ня могуць выканаць загатовак. Асобныя члены ячэек адкрыта выступаюць супроць збожжазагатовак і займаюцца пакражай (Ліпская ячэйка і ячэйка саўгасу «Камінтэрн»).

Сакратар Бягомльскага сельсавету **Длужнеўскі**—кулак, былы дваранін, падрабляе сабе і свайму брату, сакратару суда, даведкі аб тым, што яны бедныя. Абодва ў

7 тысяч ахвяр паветранай бамбардыроўкі Шанхайгуаня

ШАНХАЙ, 6. Кітайская газэта «Істэрн Таймс» паведамляе, што японская ўлада вырашылася за чыстку Шанхайгуаня ад кітайскіх скайграў. Бязупынна прыходзяць тушыць пажары, якія выбухнулі ў розных частках горату. Кітайцы, у якіх знаходзяць зброю, тут-жа забіваюцца японцамі. **Вялікая колькасьць кітайскай моладзі заключана ў турмы.** На станцыі Шанхайгуань пачаты японскі сьпыт і сьцяг Манчжурскай дзяржавы. Газэта таксама ўлазвае, што **ў рэзультаце паветранай бамбардыроўкі загінула 5.000 чал. грамадзянскага насельніцтва і 2 тыс. салдат.**

Напружанае становішча ў правінцыі Жэхэ

ШАНХАЙ, 5. З Бэйпіну паведамляюць, што з прычыны акупацыі японцамі Шанхайгуаня, абстаноўка ў правінцыі Жэхэ стала яшчэ больш напружанай. Становішча Кайлу і Фусіна (на паўночным усходзе Жэхэ) крытычнае. Паведамляюць таксама **аб сутычках паміж японцамі і кітайцамі ў раёне Кайлу і аб сутычках каля Наліну.**

Масавае ўцяканьне кітайцаў з Чапэю

ШАНХАЙ, 6. Насельніцтва **Чапэю, Усуну, Цзянвану і інш. прыгарадоў Шанхаю ахоплена панікай.** Баючыся паўтарэньня леташніх падзей, насельніцтва масамі пакідае пры гарады. У барацьбе з палічнымі настроямі кітайская ўлада прымае рашучыя меры, аж да арышту. У сувязі з заняпцем Шанхайгуаня і пешкаком паўтарэньня летапіціх падзей курс акцыяў кантоўных паперэ значна на зьнізіўся. Шанхайская біржа закрыта.

Пагром тубыльцаў на Ямайцы

Як падае польская фашысцкая прэса, **англельская вазенчыка ў Кінгстоне, на Ямайцы, наладзіла крывавы пагром над тубыльцамі насельніцтвам гэтага вострава.** Прычынай жудаснага пагрому тубыльнага насельніцтва зьявілася забойства льяным тубыльцам ангельскага салдата ў адным з начных шынкоў. Калі аб гэтым даведалася ангельскае камандаваньне, дык яно наладзіла над тубыльцамі крывавую расправу. Салдаты ангельскага гарнізону, нібы напераракор распараджэньню афіцэраў, кінуліся самавольна распраўляцца над безабаронным насельніцтвам. (Як гэта ўсё нагадвае яўрэйскія пагромы ў Львове, дзе польскае фашысцкае студэнцтва таксама нібы напераракор улазе, а ў сапраўднасьці пры актыўнай дапамозе палічы граміла яўрэяў. Ред.) Сотні салдат прымалі ўдзел у пагроме тубыльцаў на Ямайцы. Разьюшаныя, споєныя салдаты разьбівалі шыбы, зьнішчалі магазыны, перакулывалі трамваі, зьбіваючы па крыві праходзіўшых на вуліцы тубыльцаў.

УЗБРАЕНЬНІ ЯПОНІІ

Віленская эндэцкая газэта «Дзеньнік Віленскі» па нагоде новага году прысьвячае перадавы артыкул сітуацыі на Далёкім Усходзе. Зрабіўшы антысавецкі выпад з прычыны адчаўленьня савецка-кітайскіх адносін, газэта са здаваленьнем падаўшае сябе і сваіх чытачоў лосьпехамі сапоньніка польскага фашызму—японскага імпэрыялізму ў Манчжурыі і асабліва ў галіне ўзбраеньняў.

Аб ваенных падрыхтаваньнях Японіі чытаем у газэце:

«У японскіх арсэналах працуе кілёць днём і ноччу. Вялікія прыватныя фабрыкі перароблены і прыстасаваны да ваенных мэт. З Эўропы ў Японію базу ныне ідуць значныя транспарты з аттрутнымі газамі, хімічнымі матэрыямі і інш. ваеннымі прыладамі. Японскае морское міністэрства нядаўна атрымала значныя сумы на ўзбраеньне флёту... Няма ні малейшага сумненьня ў тым, што Японія рыхтуецца да вайны».

Адначасова з гэтым—піша далей газэта—значна пашырана морская база ў Курэ, дзе зараз ліхаманкава працуе 18.000 рабочых.

Ваенны арсэнал у Івакупі значна пашыран і зараз выробляе атрутныя газы. Фабрыкі «Ніхон-нафта» і «Ніхон-Ацэтык» у Сіманасеку і Шыкаціма прыстасавана да ваенных мэт і зараз выробляюць порах. Таварыства «Ніхон-азот» пусьціла ў рух фабрыку па вырабу нітраглікэрыны.

Фабрыка па вырабу парфумы «Кіано» ў Асако зараз выробляе хімічныя матэрыі для ваенных мэт. «Японскае таварыства вырабу цэлюлёзу» будуе другую фабрыку ў Кандзакігава. Таварыства па вырабу штучнага шоўку набудавала другую вайсковую фабрыку недалёка ад порту Курэ, прычым пашчна гэтай фабрыкі займае 400.000 кв. ярдаў. У мясцовасьці Окума набудавана алюмінієвая фабрыка для ваенных мэт. Значна пашыраны фабрыкі па выплаўцы жалеза ў Явата і Дока, дзе выробляецца ў вялізарнай колькасьці спэцыяльны калочы дрот. Арсэнал у Какуро пашыраны на 12.000 кв. ярдаў.

Склады выбуховых матэрый у Манчжурыі таксама значна пашыраны. Ваенны аэрадром у Сарэба перабудаваны і прыстасаваны да павейшых патрабаваньняў. Апрача таго, пачалося будаўніцтва некалькіх іншых ваенных аэрадромаў. У Асако ідзен данцкія склады ў апошнія часы значна пашыраны.

Вышэй паданыя факты ўзбраеньняў японскага імпэрыялізму, як зазначае нават сама газэта, **складаюць толькі дробную частку ўзбраеньняў Японіі.**

Другая фашысцкая газэта «Газэта польска» паведамляе, што па загаду японскага ўраду 100.000 афіцэраў запасу вывучае зараз лётную справу.

Вялікі палітычны працэс у Варшаве

ВАРШАВА, 6. 3-га студзеня ў Варшаўскім акруговым судзе пачаўся вялікі палітычны працэс супроць 11 трамвайшчыкаў па абвінавачаньні ў арганізацыі і ўдзеле ў забастоўцы трамвайшчыкаў у чэрвені 1931 году. Апрача таго, паводле акту абвінавачаньня, падсудныя яшчэ абвінавачваюцца ў прыналежнасьці да кампартыі і ў камуністычнай аґітацыі сярод рабочых Варшавы.

Як вядома, забастоўка трамвайшчыкаў у чэрвені 1931 году была выклікана барбарскай эксплёатацыяй рабочых і новым зьніжэньнем зарплаты. Забастоўка гэта насіла надзвычай бурны характар.

Па лаўцы падсудных сядзяць: **С. Астроўскі**, сьлесар, **А. Клос**—сьлесар, **В. Скшынэк**—трамвайны кандуктар, **С. Завадзкі**—трамвайны рабочы, беспрацоўны, **Я. Мілеўскі**—шофэр, беспрацоўны, **Я. Хэнцінскі**—кацельшчык, **С. Врубель**—токар, **Тамашэўскі**—беспрацоўны, **Куцінскі**—каваль, **І. Дамалеўскі**—столяр і **Я. Худы**—цесьляр.

Як зазначае сацыял-фашысцкі «Роботнік», акт абвінавачаньня займае 36 старонак машыннага друку. На расправу выклікана абвінавачаньнем зьнішчэньня 100 сьведак. Працэс будзе працягвацца каля двух тыдняў.

Суд складаецца з старшыні суда—**Ляшчынскага** і судзьдзяў: **Пшыбылоўскага і Д. Дэмбіцкага.** Абвінавачвае прокурор **Руднідзі.**

Працэс выклікаў вялізарнае абурэньне сярод варшаўскіх трамвайшчыкаў. Будынак суда акружан узмоцненымі атрадамі пешай і коннай паліцыі з кулямётамі. Значны паліцэйскі атрад уведзен у будынак суда. Заля суда, калідор перапоўнены трамвайшчыкамі.

Прадажнасьць польскай фашысцкай прэсы

ВАРШАВА, 9. У Гдыні адбываецца зараз судовы працэс фірмы «Атлянтык».

У часе судовай расправы сьведка **дырэктар Вітальд Масевіч паказаў, што ў сакавіку мінулага году фірма «Атлянтык» заплаціла і «Ілюстраванаму Кур'еру Цодзенному» ў Кракаве 1.000 злотых за зьмяшчэньне рэкляміднага артыкулу ў абарону фірмы.** У гэтым артыкуле рэдакцыя выступіла з высьвятленьнем, што абвінавачаньне фірмы ў падробках не адпавядае сапраўднасьці.

САКРЭТНАЕ СПАТКАНЬНЕ ГІТЛЕРА З ФОН-ПАПЭНАМ

БЭРЛІН, 6. У центры ўвагі германскай прэсы знаходзіцца **спатканьне фон-Папэна з Гітлерам у Кёльне.** Факт гэтага патаемнага спатканьня, выкрыты ўчора блажэй да колаў фон-Шлейхэра, «Тэглішэ Рундшау», сёньня прымушаны прызнаць як фон-Папэн, так і нацыянал-сацыялісцкая партыя. Апошняя апублікавала ў сувязі з гэтым афіцыяльнае паведамленьне, у якім прабуе змазаць значэньне гэтага спатканьня. У паведамленьні гаворыцца, што Гітлер вёў з Папэнам «толькі свабодную гутарку аб палітычных падзеях апошняга тыдню». Апублікавана так сама заява фон-Папэна, як зазначае, што яго гутарка з Гітлерам датычыла пытаньня аб уключэньні нацыянал-сацыялістаў у «нацыянальную канцэнтрацыю» і адмаўляе, што гэтае спатканьне было накіравана супроць фон-Шлейхэра.

«Бэрлінэр Тагеблат» задае пытаньне, хто ўпаўнаважваў фон-Папэна весьці перагаворы аб уключэньні нацыянал-сацыялістаў у «нацыянальную канцэнтрацыю» і на якой падставе ён, пасьля свайго выхаду ў адстаўку, вядзе перагаворы з лідэрамі партыі? «Тэглішэ Рундшау» падкрэсьлівае, што зблізканьне Папэна з Гітлерам было дасягнута намаганьнямі аграрыяў і паўных прамысловых колаў, а таксама асоб блізкіх да Гугенбэрга, сярод якіх усё больш расьце незадаволеньне палітыкай фон-Шлейхэра.

Заслугоўвае таксама ўвагі паведамленьне раду добра праінфармаваных газэт, у прыватнасьці **«Франкфуртэр Цэйтунг»** аб тым, што спатканьне Кёльнскага спатканьня вы ходзіла зад нацыянал-сацыялістаў. Гэтая ака лічваецца ілюстрацыяй узрастаючае замяшанасьці ўнутры нацыянал-сацыялісцкага кіраўніцтва, якое перад тварам крызісу нацыянал-сацыялістычнага руху, які бязупынна наглыбляецца, ліхаманкава шукае выхаду для свайго ўдзелу ва ўрадзе.

Адначасова растуць труднасьці габінэту фон-Шлейхэра. Фронт праціўнікаў дэкрэту аб абавязковай прымесі германскага масла да маргарыну пашыраецца.

Міністар харчу настаяніў шакуль успрымацца ад ажыцьцяўленьня гэтага дэкрэту і перапаць пытаньне яшчэ раз на абмеркаваньне экспартаў. Урад сустракае ўсё больш ныя супраціўленьні і па пытаньні аб праграме «адшкаджаньня работы для беспрацоўных». Шырокія колы прадпрыемцаў, асабліва рашуча выступаюць супроць намеру скарыстаць для фінансаваньня гэтай праграмы падатковыя боны, выпушчаныя на асновы надзвычайнага дэкрэту фон-Папэна.

«Дэйчэ-Альгемэйне Цэйтунг» піша: «У шырокіх гаспадарчых колах павялічыўся пенакой, што за сьнежаньскай гульнёй у ярлыкі, ахвярай якой сталі некаталькі надзвычайных дэкрэтаў фон-Папэна, хутка пасьлядуе штурм на важную сустрэчную частку экспанічнай праграмы фон-Папэна — прэмію за пашырэньне вытворчасьці. Давер'е да ўраду ня пашта ўзрасло пасьля таго, як заўчасное скасаваньне дэкрэту аб зьніжэньні зарплаты парушыла меркаваньні ўсіх прадпрымальнікаў, якія скарысталіся прадстаўленым гэтым дэкрэтам правам.

Стабільнасьць становішча можа быць дасягнута ў тым выпадку, калі ўрад пітыма будзе ўлічаць пажаданьня разьлічаных на доўгі тэрмін гаспадарчых плянаў. Між тым, на жаль, такія парушэньні ня раз мець месца ў апошнія часы. Прыпомнім толькі дэкрэт аб маргарыне і раптоўную забарону пашырэньня універмагаў, якія гандлююць таварамі адной цаны. Нязай і рэйхстаг улічыць гэтыя пажаданьні — заключае газэта, калі ён намерэн у бліжэйшыя тыдні заняцца абмеркаваньнем гаспадарча-палітычных пытаньняў».

СПРАВА КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЯНЭРАЎ-ШКОДНІКАЎ З БЕЛДЗЯРЖСНАБУ

Першы дзень суда быў прысьвечан допыту абвінавачаных Фурсо, Раманоўскага, Бельскага.

Ужо з паказаньняў гэтых трох падсудных становіцца зусім ясным, што сыстэму круговой парукі, якая існавала ўвесь час у апараце Белдзяржснабу, шкодніцкая група гарашыла цьвёрда праводзіць і на судзе. Адзін другога выгарашчвае, адзін другому дапамагае хлусіць. І ў першую чаргу, усе, як адзін, імкнуцца выгарадзіць галоўнага «цэй нага» юкаўніка і натхніцеля групы — нацдэма Талкача. «Ён, злоў, ня мэў з намі ніякай сувязі, усё рабілася самастойна, кожным паасобку».

Але хаўрэма... Спробы заманаць палітычную сутнасьць справы, зьвесьці ўсё да «звычайных» злоўжываньняў паасобных работнікаў канцтаркова прэвалькюцца пад перакрыжным агнём пытаньняў старшыні і членаў суда, дзяржаўнага абвінаваўца.

Першым дапытваецца Фурсо Аркадзь, — загадчык базы № 2 БДС, якая фактычна ператварылася ў аспоўную базу самаснабжэньня і раскрадваньня дзяржаўнай маемасьці.

Фурсо прызнае сябе вінаватым, але імкнецца даказаць, што раскрадваньне матар'ялаў рабілася толькі па «несьвядомасьці», што гэта было «выцяцкова» і г. д.

«Нумар», аднак, не ўдаецца. Высьвятляецца, што ў апараце БДС працавалі даволі «сьвядомыя» людзі, якія добра ведалі і нават прапрацоўвалі законы ўраду. Пасьля апублікаваньня пастановы ЦВК СССР ад 7 жніўня аб мерах барацьбы з раскрадваньнем дзяржаўнай маемасьці, у БДС адбыўся зьлёт праціўнікаў. На зьлёце прапрацоўвалася гэта пастанова. Дакладчыкам выступае... Талкач. Дакладчык, зразумела, расьпінаўся за сваячасовасьць і важнасьць пастановы ўраду, ганьбіў зладзеяў і раскрадальнікаў дзяржаўнай маемасьці, «даказваў» неабходнасьць самай жорсткай барацьбы в гэтымі зьявішчамі і г. д.

А потым, пасьля ходу Талкач даваў даручэньні сваім падпарадкаваным, ва што-б там ні стала дастаць для яго той ці іншы матар'ял, тыя ні іншыя прадукты. Потым «дакладчык» езьдзіў у Гомель дагаварвацца аб таварообменных зьдзелках з Гом сельхарцтромам, аб разбазарваньні востра-дэфіцытных матар'ялаў...

Паказаньні Фурсо, а таксама і іншых падсудных — абвінавачэньні акт усяму кіраўніцтву Белдзяржснабу. Гэта яркі малюнак бесгаспадарчасьці, бесгаразгку, бясьсістэмнасьці, адсутнасьці кіраўніцтва ў рабоце БДС. Паэт'ячэйка, дырэкцыя, мясцком, не адчуваліся. Яны яўна згубілі клясавую пільнасьць, не заўважалі, што робіцца ў іх-жа пад носам. Больш таго, некаторыя «камуністы» проста зрасьліся з клясавым ворагам, патуралі хаосу і блытаніне, амаль узкопчэкі у апараце БДС, аб'ектыўна дапамагалі раскрадальнікам дзяржаўных фондаў.

Каапкамісія... Зусім правільна прокурор пераімеляваў яе ў «хапкамісію». Гэта была «камісія» рвачоў і самаснабжэнцаў, гатовых на любую злачынную «зьдзелку», абы дастаць больш прадуктаў, больш прамтавараў. Каапкамісія лічыла зусім магчымым і «законным» распараджацца востра-дэфіцытнымі таварамі са складаў і баз, раздаваць іх направа і налева ў абмен на яйкі, сыр, каўбасу, мяса, булкі, цукеркі і г. д. Гэта рабілася, зразумела, з сакрэцыі і благаславеньня дырэкцыі. На чале каапкамісіі стаяў сакратар мясцкому, буржуазны перадзвонец Вайнэр. Нязьменным членам каапкамісіі — шкодник Малаўскі.

Вернемся, аднак, да Фурсо з яго «тэорыяй выпадковасьці». Абвергнуць гэту «тэорыю» было, зразумела, зусім ня цяжка. Даволі было дзяржаўнаму абвінаваўцу і старшыні спэцыяльнай прысутнасьці прывесьці доўгі сьпіс тавараў і матар'ялаў, раскрадзеных і разбазаранных Фурсо ў кампаніі з Раманоўскім, Бельскім, калчакавцам Герцам і інш. Заваднта ўжо арганізаванага і сыстэматычная «выпадковасьць».

«Выпадкова» Фурсо і Раманоўскі прадалі Герцу (камэнданту школы № 22 і загадчыку дамамі № 69) бочку аліфы па цане 2 р. 50 кап. за кгр., замест пройскурантнай цаны 61 кап. Гэты продаж ня быў праведзен па справаздачы і грошы палажан пастуцыі ў кішэні Фурсо, Раманоўскага і Герца. Апошні склаў потым фіктыўны рахунак на гэтую бочку аліфы і правёў яго па сваёй «справаздачнасьці».

«Выпадкова» Фурсо адпускаў клей, мыла, цвікі і інш. востра-дэфіцытныя матар'ялы «сваім людзям» капітана Палякова, Малаўскага, Дзіэрштэйна і інш. «Выпадкова» ён адпраўляў у Магілеў і іншыя гарады розныя тавары, атрымліваў адтуль па 300-400 руб. грошай і заяўляў, што гэта «гапарар» за надрукаваньні ім вершы ў раённай газэце.

«Выпадкова» Фурсо сыстэматычна п'янстваваў і кутіў на кватэрах і ў рэстаранах разам з Раманоўскім, Бельскім, Герцам і інш.

І гэтак далей, і гэтак далей.

Усё гэта было «выпадкова». Не выпадкова толькі ўсе гэтыя шкодніцкі трапілі на лаву падсудных. У гэтым «віна» АДПУ—абнаходнага мяча партыі і рабочай клясы для барацьбы з контр-рэвалюцыяй, з ворагамі дыктатуры пралетарыяту.

Раманоўскі Генрых... у адрозьненьне ад Фурсо імкнецца паказаць сябе перад судом «сьвядомым», «адданым» рабочай клясе.

Раманоўскі — былы рабочы, камсамолец. Але камсамолец, які перарадзіўся і стаў здраднікам камсамолу, ворагам рабочай клясы. Толькі так можна кваліфікаваць «камсамольца», які, ведаючы аб усіх злачынствах у апараце Белдзяржснабу, аб існаваньні контр-рэвалюцыйнай групы, ня толькі ні выкрыў яе, не паведаміў адпаведным органам аб злоўжываньнях на базах і складах, а наадварот сам уключыўся ў гэтую групу, стаў на шлях раскрадваньня і разбазараваньня дзяржаўнай маемасьці.

У апараце Раманоўскі лічыўся некаторы час адказным выкапаўцам па рацыяналізацыі. Фактычна-ж ён быў «рацыяналізатарам»... сыстэмы раскрадваньня матар'ялаў, бесгаспадарчага ашукваньня дзяржавы.

А зараз гэты «камсамолец» — мае наглаасьць заявіць суду:

— Я лічыў, што нічога злачыннага няма ў продажы матар'ялаў звыш прэйскурантных цэн. Дзяржава ад гэтага ня церпіць (!).

Бельскі Мікола — тып кваліфікаванага злодзея, грабежніка, бандыта. Патомны чалавек у контр-рэвалюцыйнай шкодніцкай групе Талкача. Сям'я Бельскага ў цэлым складаецца са злачынцаў. Бацька яго знаходзіцца ў папраўча-працоўных лагерах, брат сасланы ў аддалёныя мясцовасьці СССР за грабеж. Бельскі сам такі-ж, як і яго бацька і брат, але больш хітры, больш небясьпечны сацыяльна элемэнт. Ён нават умудрыўся пралезьці ў кандыдаты КП(б)Б, каб, прыкрываючыся партыйным білетам, лягчэй рабіць сваю шкодніцкую контр-рэвалюцыйную справу.

Бельскі служыў агентам матар'яльнага складу МББ чыгункі. Карыстаючыся службовым становішчам, ён дапамагаў Фурсо і Раманоўскаму перапраўляць накрадзеныя тавары ў розныя гарады БССР, дзе гэтыя тавары рэалізавалі. На стале ў пракурора цэлая кіпа «рахункаў» розных арганізацый, ад якіх гэта тройка атрымлівала грошы за прададзеныя тавары.

— Чаму вы не пераводзілі грошы праз банк, а заўсёды імкнуліся атрымліваць наўмы, — пытаецца пракурор.

— Фурсо сказаў мне, што ў іх ёсьць спэцыяльная бухгальтэрыя, — адказвае Бельскі.

Гэта праўда. Група мела сваю спэцыяльную бухгальтэрыю, якая дапамагала ёй утаіваць на працягу доўгага часу свае злачынствы, рабіць больш ня прыкметным абкрадваньне дзяржаўных складаў і баз. Кродытная рэформа для злачынцаў, зразумела, была нявыгоднай. Грошы засьцілаліся наўмыснымі проста таму, што пераводзілі іх праз банк было «небясьпечным».

Мэтад паказаньняў Бельскага на судзе — або хлусьня, або пацэсальнае плячыма: «ня ведаю», «ня памятаю».

Але хлусьня выходзіць надта наўкала, а спасыланьне на кароткую памяць яшчэ горш. Пры анкетным апытаньні ў пачатку суда Бельскі паказаў, што быў кандыдатам КП(б)Б. А на заўтра ён «забывае» аб гэтым і заяўляе суду, што ні колі ў партыі ня быў. Затым ён зноў гаворыць аб сваёй партыйнасьці.

Шматлікія крадзяжы на чыгунцы і з баз Белдзяржснабу, зробленыя Бельскім, Фурсо, Раманоўскім — факты, ад якіх ня могуць адмаўляцца нават самі падсудныя.

У пачатку 1932 г. Бельскі паведаміў Фурсо аб тым, што на складзе МББ ляжыць охра, сажа, алёфа і інш. матар'ялы і запрасіў яго выкінуць рахунак, быццам гэтыя тавары набыты ў Белдзяржснабе. Па гэтым рахунку Бельскі атрымаў усе гэтыя тавары і прадаў на рынку. Паводле прыблізнага падліку агульная сума складала каля тысячы рублёў. У маі мінулага году Бельскі і Фурсо зноў правялі такую «аперацыю» і зноў апусьцілі ў кішэню тысячу рублёў. У кастрычніку — трэцюю аперацыю, якая дала 2.000 руб. і г. д. Усе «заробленыя» грошы потым спускаліся на выпіўкі, на куцёж у рэстаранах, на пакупку кантоўных рочаў і г. д.

Разам з Фурсо, Бельскім у напойках прымаў удзел «нейкі селянін», якому, па прэтэнзіі Бельскага адпускаўся тавар з крам ТСТ і Белдзяржснабу, без усякіх перашкод.

— Хто гэта «нейкі селянін»? пачынае высьвятляць пракурор тав. Лінскі.

Бельскі спачтку ўхіляецца ад адказу, але потым трымушан прызнаць, што «нейкі селянін» ні хто іншы, як кулак Іван Палянчук, які прасіў «партыйца» Бельскага складці яму пратэкцыю ў органах улады.

Справа ясная. Група шкодніцкаў не абмяжоўваецца выключна вузкім сьпісам Белдзяржснабу, а мае сувязь з клясава-варожымі элемэнтамі, з кулакамі і заможнікамі, якія разам з Талкачамі, Малаўскімі, Фурсо і Бельскімі імкнуцца падарваць мерапрыемствы партыі і ўраду, перашкодзіць пасьпяховаму разгортваньню сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне.

***

Далейшы допыт Бельскага пераносен на наступны дзень.

С. ГАЛКІН.

Умовы прыёму ў завочную саўпартшколу на 1932-33 г.

1. Завочная саўпартшкола ставіць сваёй мэтай павысіць тэарытычны ўзровень марксыцка-ленінскіх ведаў і даць арганізацыйна-практычную падрыхтоўку і перанадрыхтоўку кіязовым партыйна-камсамольскаму і беспартыйнаму актыву.

2. Вучэбны плян завочнай саўпартшколы разьлічан на 2 з паловай гады, з іх кожны год адзін месяц заняткаў на курсах-канфэрэнцыях.

3. У завочную саўпартшколу (і на вывучэньне паасобных прадметаў на праграме саўпартшколы) прымаюцца: члены партыі, камсамолу, а таксама беспартыйныя рабочыя, калгаснікі, з актыву саўгасаў, калгасаў, МТС і прадпрыемстваў (члены бюро партыйных, камсамольскіх ячэек, члены праўленьня калгасаў, члены рабкомаў, брыгадзіры, уласьнікі і г. д. У ліку камандыраваных павінна быць ня менш 25 проц. камсамольцаў. Беспартыйных у складзе камандыраваных можа быць ад 20 да 25 проц.

4. Ад паступаючых у завочныя саўпартшколы патрабуецца агульна-адукацыйная падрыхтоўка ў абёме чатырохгодкі і агульна-палітычная ў абёме вячэрняй саўпартшколы.

5. Завочнікі, пасьпяхова прапрацаваўшыя курс саўпартшколы і злачыўшыя адпаведныя залікі і іспыты, прыраўноўваюцца ў правах да скончыўшых стацыянарныя саўпартшколы.

6. Паступаючыя ў завочную саўпартшколу павінны прадставіць у завочны сэктар анкеты з аўтабіяґрафіяй, праверачную пісьмовую работу і рэкамэндацыю партарганізацыі.

7. Кандыдатуры камандыраваных у саўпартшколу павінны зацьвярджацца райкомам партыі й залічваюцца толькі пасьля прахаджэньня ўстаноўчай канфэрэнцыі.

8. Прыём завочнікаў на вучобу правядзіцца завочнымі сэктарамі саўпартшколы. Прынятыя на завочнае навучаньне таварышы атрымліваюць ад саўпартшколы паведамленьне аб прыёме.

9. Усе прынятыя на завочнае навучаньне павінны безадкладна: а) далучацца на адпаведны вучэбны матар'ял, згодна ўказаньняў сэктара; б) паклапаціцца аб набыцьці неабходнай літаратуры па ўказаньні сэктара, забясьпечыць сабе магчымасьць карыстацца дапатковай літаратурай з мясцовых партыйных і грамадзкіх бібліятэк; в) прымацавацца да бліжэйшай радыё-аўдыторыі і культпункту.

РАЗЬВЕРСТКА Ў ЗАВОЧНЫЯ САЎПАРТ. ШКОЛЫ

ГОМЕЛЬСКАЯ СПШ

Гомельскі раён усяго 20 (з іх камсамольцаў 5), Рэчыцкі—20 (5), *) Бабруйскі — 20 (5), Мазырскі — 15 (4), Жлобінскі — 15 (4), Хойніцкі — 10 (3), Веткаўскі — 10 (3), Буда-Кашалёўскі — 8 (2), Ўваравіцкі — 7 (2), Петрыкаўскі — 7 (2), Чаўсрскі — 6 (2), Лоеўскі — 6 (2), Камарынскі — 7 (2). Пятрыкоўскі — 6 (2), Тураўскі — 8 (2). Жытковіцкі — 8 (2), Лельчыцкі — 10 (3), Нараўлянскі —6 (2), Брагінскі — 6 (2), Ельскі — 6 (2), Слуцкі — 10 (3), Старобінскі — 7 (2), Ста-Дарожскі — 6 (2), Любанскі — 6 (2), Глускі — 6 (2), Чырвона-Слободскі — 6 (2), Перыцкі — 6 (2).

ВІЦЕБСКАЯ СПШ

Віцебскі — 20 (5), Аршанскі — 20 (5), Полацкі — 15 (4), Барысаўскі — 15 (4), Дуброўенскі — 12 (3), Чашніцкі — 10 (3), Сіроцінскі — 8 (2), Сенненскі — 8 (2), Расонскі — 7 (2), Талачынскі — 8 (2), Сураскі— 7 (2), Лепельскі — 8 (2), Лёзьнянскі — 8 (2), Гарадоцкі — 7 (2), Вушацкі — 7 (2), Бешанковіцкі — 6 (1), Асьвейскі — 5 (1), Пленчанскі — 5 (1), Бягомльскі — 5 (1), Лагойскі — 5 (1), Горацкі — 5 (1), Дрысенскі — 7 (2), Крупскі — 5 (1), Мсьціслаўскі — 6 (2).

МАГІЛЕЎСКАЯ СПШ

Магілеўскі — 15 (4), Менскі — 15 (4), Заслаўскі — 7 (2), Дзяржынскі — 7 (2), Вузьдзенскі — 5 (1), Пухавіцкі — 5 (1), Чэрвеньскі — 5 (1), Бярозінскі — 5 (1), Смалявіцкі— 6 (2), Радашкоўскі — 7 (2), Карманскі — 8 (1), Быхаўскі — 7 (2), Клічаўскі — 5 (1), Асіповіцкі — 7 (2), Пукавіцкі — 5 (1), Чэрыкаўскі — 5 (1), Чырвонапольскі — 5 (1), Быховіцкі — 5 (1), Шклоўскі — 7 (2), Чавускі— 5 (1), Касьцюковіцкі — 7 (2), Клімавіцкі — 7 (2), Капыльскі — 5 (1), Ігрыцаўскі — 7 (2).

Заг. Культпропу ЦК КП(б)Б
ЛЯЎКОЎ.
Дырэктар ІМЗО пры ЦК КП(б)Б
ЯГОРАЎ.

*) У дужках паказан лік камсамольцаў.

Паведамленьне

8 студзеня, у 23 гадзіны адбудзецца ўсебеларуская радыёнарада па пытаньні шэфскай работы ў сувязі з загатоўкамі.

З дакладам павінны выступіць кіраўнікі шэфячэек пікэйпакажаных прадпрыемстваў: па Менску — «Камунар», «Акцябр», «Бальшавік»; па Гомелю — завод імя Леніцкага, Гомсельмаш, «Камінтэрн»; па Віцебску — «Сьцяг індустрыялізацыі», чыгуначны вузел, «Дзьвіна»; па Барысаву: «Пралетарская перамога», «Камінтэрн»; па Бабруйску — дрэвапрацоўчы камбінат; па Магілеву — — пашыўная фабрыка і імя Валадарскага; па Рэчыцы — імя «Х-годзьдзя Кастрычніка; па Воршы — БелДРЭС і чыгуначнае дэпо і агітмасы таргкомаў і райкомаў партыі.

На нарадзе абавязаны прысутнічаць агітмасы ячэек пераліченых прадпрыемстваў.

Агітмас ЦК КП(б)Б

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Памяшканьне польскага дзяцінтэатру
(Савецкая, 28, тэл. 15-20, 21612)
ЭСТРАДНЫ ТЭАТР
„ДАМЗЦ"
СЕНЬНЯ выступаюць лепшыя артысты эстрады В. І. Гапін, П. Я. Курэнэр, М. К. Нароўская і інш.
Пачатак роўна ў 8 палов. гадз. вечара.
Білеты ў рабкасе з 12 да 2 і з 4 да 5 гадз. веч.
І ў касе тэатру з 5 да 10 гадз. вечара.

Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

Чырвоная Зорка. Каса—ад 1 г. дня. Заняты выставкі фільм ЖАНЧЫНА ГОРНЫХ УЗВЫШШАЎ. Гукавы сакэкіно-журнал № 14
Інтэрнацыянал. Каса—ад 12 г. дня. Нямецкі выставкі фільм ГОРНАЯ БАЛЯДА. Звыш праграмы—Кіно-хроніка
Кіно „ПРАЛЕТАРЫ". Новы выставкі фільм У ВЯЛІКІМ ГО АДЗЕ. 2) Часоп. Белдзяржкіно № 15. Дзённыя сэансы для дарослых. ДУЖАЯ НЕПЕРАМОЖНЫЯ. Часопісь Белдзяржкіно № 15
Кіно СПАРТАК. Ад 7 студзеня НА ЭКРАНЕ Ігар ІЛЬЛІНСКІ: КАЛІ ПРАБУДЖАЮЦЦА МЁРТВЫЯ. Камедыя ў 6 частках. Штодзённа 5 сэансаў. КАСА адкрыта з 1 гадз. дня.

Да ўвагі БРЫЗ'аў аб'яднаньняў, трэстаў, прадпрыемстваў і вынаходцаў.
Новаарганізаваны пастановай Наркамцяжпраму
УСЕСАЮЗНЫ ТРЭСТ
эксперымэнтальных заводаў „ВТЭЗ"
прымае ў распрацоўку і рэалізацыю вынаходзтваў, а таксама заказы на выраб прамузраў на вынаходзтвы і рабочыя прапановы.
Зварачацца: Масква, Армянскі пер 2

ПРАЎЛЕНЬНЕ АРЦЕЛІ
„Чырвоны Транспартнік"
Менск, Масноўская, № 1-1
ПАВЕДАМЛЯЕ, што будаўнічыя арганізацыі і іншыя прадпрыемствы гор. Менску, якія жадаюць атрымаць
ТРАНСПАРТ
у 1933 годзе, што яны павінны ЗАКЛЮЧЫЦЬ З АРЦЕЛЬЛЮ ДАГАВАРЫ
Без дагавораў работы вытвярацца на будуць.
Тэрмін для заключэньня да аўвароў устанаўляецца
да 20 студзеня 1933 г.
Праўленьне.

ПРЫЁМ
на менскія 8-месячныя
ПЭДКУРСЫ
працягнут да 15 студзеня.
Заявы з дакумэнтамі аб узросьце, адукацыі і сацыяльным становішчы накіроўваць:
Менск, Гарана.
Усе зарлічаныя на курсы забясьпечваюцца стыпэндыяй ад 50 да 75 руб. і прыналежныя—інтэрнатам.
Гарана.

У аддзел аб'яў звяцца па тэлефону 7-81

Сэктар кадраў ВОСУ (б. О У)
АРГАНІЗУЕ
5-месячныя КУРСЫ по подрыхтоўцы РАХУНКАВОДАЎ
для сыстэмы Белуціль.
Стыпэндыя ад 50 да 100 руб. у месяц і кватэрных—25 руб.
Інтэрнатам курсанты не забясьпечваюцца.
Пасьля сканчэньня курсаў курсанты абавязаны працаваць 2 гады ў сыстэме Белуціля ў раённых цэнтрах.
ЗАЯВЫ з дакумэнтамі: аб саст. становішчы, аб адукацыі (на ніжэй 6 груп), аб узросьце (на менш 17 год) прымаюцца ў канцылярыі ВОСУ (г. Менск, Камуністычная, 16 „УНХУ", 2-гі паверх, пакой 10)
да 25 студзеня 1933 г.
ад 12 да 2 гадз. дня штодзённа.
Заявы без пералічаных дакумэнтаў разглядацца на будуць.

ВАЕНСАНТЭХБУДУ
ТЭРМІНОВА ПАТРЭБЕН
БУХГАЛЬТАР-ІНСПЭКТАР
ЗВАРАЧАЦЦА: Мопраўская, 73
да начальніка СУО тав. ГУЛІСУ

БЕЛАПТЭКАКІРАЎНІЦТВАМ
арганізуюцца
гадовыя курсы аптэчных тэхнікаў
у г.г. Менску, Гомелі, Магілеве і Воршы.
На курсы прымаюцца асобы з адукацыяй у абёме школы першай ступені ва узросьце не моладзей 16 год.
Заявы накіроўваць у канторы Белаптэкакіраўніцтва паказаных вышэй гаводоў.
Да заяў прыкласьці дакумэнты аб адукацыі, аб сацыяльным становішчы і аб узросьце.
Прыём заяў да 15 студзеня 1933 г.
Заняткі на курсах вячэрнія. 50 проц. курсантаў забясьпечваюцца стыпэндыяй у сярэднім 45 руб. у месяц і кватэрнай платай.
Скончыўшыя абавязаны працаваць у сыстэме Белаптэкакіраўніцтва на менш 2-х год.
Белаптэкакіраўніцтва.

Партыйчэйка, мясцком, адміністрацыя і калектыў супрацоўнікаў Беларускай Дырэкцыі „САЮЗТРАНС" выказваюць спачуваньне сям'і з прычыны сьмерці, пасьля цяжкай і доўгай хваробы, супрацоўніцы